Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 46 (2844) Год LV | Беласток, 14 лістапада 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

З такім лозунгам Бельская кааліцыя (БК), якая ўжо 16 гадоў дзейнічае на Бельшчыне, ідзе на самаўрадавыя выбары і верыць, што яе кандыдат Пётр Божка стане бурмістрам Бельска-Падляшскага. Пётр Сэльвесюк з'яўляецца кандыдатам БК на войта Арлянскай гміны, а шмат вядомых і шанаваных асоб сталі кандыдатамі ад гэтай кааліцыі на павятовых, гарадскіх і гмінных радных у Бельскім павеце.

Аляксей МАРОЗ

БЕЛЬСК ЗАСЛУГОЎВАЕ ЛЕПШАГА КІРАВАННЯ

Размова з віцэ-старастам Бельскага павета і кандыдатам на бурмістра Бельска-Падляшскага ***Пётрам Божкам***

— Што Бельскай кааліцыі, якая ў Радзе павета з'яўляецца правячым кааліцыянтам, удалося зрабіць на Бельшчыне?

— Можна сказаць, што самаўрадавая рэформа недакончаная і зараз у паветах мала ўласных даходаў з падаткаў. Большасць павятовых бюджэтаў састаўляюць субвенцыі і датацыі, а гэта абмяжоўвае інвестыцыйныя магчымасці. Аднак мы стараемся прыцягваць еўрасаюзныя сродкі і інвестуем. У 2007-2010 гадах удалося нам з вялікім укладам з гмінных бюджэтаў перабудаваць больш за 70 кіламетраў павятовых дарог. Вялікім нашым праектам была тэрмамадэрнізацыя школьных будынкаў. Мянялі мы аконную сталярку, уцяплялі школьныя будынкі і мадэрнізавалі абагравальныя ўстаноўкі. Каля Комплексу школ № 1 у Бельску збудавалі мы спартыўную пляцоўку „Орлік" і працягвалі мадэрнізацыю бальніцы. У Бельскім белліцэі будынак прыкрылі новым дахам, уцяплілі вонкавыя сцены і правялі рамонт усярэдзіне. З выкарыстаннем сродкаў з Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі ў гэтай школе некаторыя кабінеты былі абсталяваны мультымедыйнай і іншай тэхнікай. Перавялі мы таксама Спецыяльную школу ў грунтоўна адрамантаваны будынак, у якім раней змяшчалася Будаўнічая школа.

— У Вас вялікі самаўрадавы вопыт на пасадзе бельскага віцэ-старасты і за Вамі вялікія поспехі. Ці маеце ўжо канкрэтныя планы адносна Бельска-Падляшскага, калі б сталі яго бурмістрам?

— Бельск-Падляшскі — гэта адзін з найважнейшых, калі не найважнейшы, горад на поўдні Падляшскага ваяводства, беручы пад увагу камунікацыйнае распалажэнне, прамысловасць і прадукцыю, паслугі і людскі патэнцыял, бо жыве ў нашым горадзе каля 27 тысяч чалавек. На жаль, колькасць жыхароў Бельска скарачаецца з году ў год, бо маладыя людзі выязджаюць за працай і гэта патрабуе ад гарадскіх улад рашучых дзеянняў, каб адмяніць гэтыя тэндэнцыі. Адмоўна ацэньваю дзеянні цяперашніх улад горада, бо ніводная вялікая суполка за апошнія 8 гадоў па ініцыятыве гарадскіх улад не адкрыла сваёй фабрыкі ў Бельску. Стаўшы бурмістрам, я буду намагацца прыцягнуць большы капітал у Бельск і захвоціць вялікія суполкі, каб інвеставалі ў нашым горадзе або побач яго. Калі будуць інвестыцыі, тады маладыя будуць астаўацца жыць у Бельску і горад будзе гаспадарча мацнець. Бельск павінен багацець разам з новаадкрытымі ў нас прадпрыемствамі, а будзе ён багаты тады, калі нашы жыхары таксама будуць багатымі.

— Вы ўжо цяпер, як віцэ-староста, уклалі многа намаганняў, каб сцягнуць вялікі капітал у Арлянскую гміну, дзе „Ікея" пачала будаваць фабрыку, у якой працу знойдзе многа бялыпчан.

— Першыя мае кантакты з прадстаўніком „Ікеі" Мар'янам Грабінскім адбыліся яшчэ ў верасні 2007 года і ад яго я даведаўся, што канцэрн „Ікея" шукае 80 гектараў пад будову вытворчага прадпрыемства. Тады больш дзесяці самаўрадаў намагаліся прыцягнуць інвестыцыю „Ікеі" на сваю тэрыторыю. На падставе патрабаванняў гэтай суполкі, каб між іншым участак пад інвестыцыю быў блізка дарожнага шляху і чыгункі, я падрыхтаваў 5 прапаноў размяшчэння фабрыкі ў нашым павеце. Чатыры мае прапановы былі на тэрыторыі вясковай Бельскай гміны і адна ў Арлянскай гміне. У 2007 годзе нашае староства зрабіла вельмі дэталёвыя абгрунтаванні прапаноў і ўвесь 2008 год мы моцна стараліся пераканаць, што самае лепшае месца для „Ікеі" менавіта ў нашым павеце. Толькі ў кастрычніку 2008 года „Ікея" выбрала з нашых прапаноў Арлянскую гміну і тады ў лабіраванне ўключыўся арлянскі войт Пётр Сэльвесюк, які сам асабіста моцна ангажаваўся ў здабыванне грунтаў. Аднак тады яшчэ большыя шанцы на інвестыцыю мела Кляшчэлеўская гміна. Каб пераканаць да інвестыцыі непадалёк ад Орлі, я з войтам Пётрам Сэльвесюком некалькі дзесяткаў разоў выязджалі ў Варшаву і правялі мы там шматлікія размовы ва ўстановах, ад якіх залежаў поспех інвестыцыі. Будова фабрыкі „Ікеі" распачалася ў канцы чэрвеня гэтага года, а ў маі або чэрвені 2011 года прадбачваецца ўрачыстае яе адкрыццё прымеркаванае да 50-годдзя дзейнасці „Ікеі" ў Польшчы. У першым этапе будзе заінвеставаных у Арлянскай гміне 1 мільярд 400 мільёнаў злотых і працу ў фабрыцы знойдзе каля 250 асоб. Мае быць збудаваны там тартак і цэх па вытворчасці, між іншым, мэблевых плітаў. Гэта цяпер самая вялікая зарэгістраваная інвестыцыя ў Польшчы. Ёсць ужо таксама чарговыя інвестыцыйныя праекты „Ікеі" ў Арлянскай гміне, якія будуць залежаць ад гаспадарчай кан'юнктуры на свеце. Накірунак развіцця нашых самаўрадаў — сцягваць да нас як найбольшы капітал, за якім пойдуць новыя месцы працы, новыя вялікія падаткі і тады будуць таксама сродкі на большыя гмінныя інвестыцыі.

— Інвестыцыі ў Бельску ідуць галоўным чынам у інфраструктуру.

— Відаць, што ў Бельску будуюцца вуліцы, тратуары, тэхніч-

працяг ☞4

9 770546 196000

Праверка „на вашывасць”

Ну вось за плячыма ў беларускага грамадства адзін з самых важкіх і вызначальных этапаў прэзідэнцкай выбарчай кампаніі. Зараз тэрытарыяльныя камісіі вядуць праверку падпісных лістоў і неўзабаве будзе вынесены вердыкт Цэнтральнай выбарчай камісіі.

Варта зняць капялюш перад лідарам партыі „зялёных” Юрыем Глушаковым. Ён прынамсі сумленна прызнаўся, што не здолеў сабраць патрэбную норму подпісаў. Афіцыйна подпісы здалі адзінаццаць прэтэндэнтаў зарэгістравацца кандыдатамі. Але, як кажуць у народзе, не хваліся нажаўшы, а хваліся змалаціўшы. Тым больш, што некалькі з прэтэндэнтаў фактычна не збіралі подпісаў, але паперы падалі і заявілі, што сабралі патрэбную колькасць. Прычым усе ведаюць, хто рэальна працаваў, а хто толькі імітаваў збор. Аднаго такога авантурніка ўжо выкрылі афіцыйна — Цэнтрвыбаркам заявіў, што Уладзімір Правальскі паздаваў ксеракопіі сямісот арыгінальных подпісаў. Навошта спатрэбіўся такі фокус віцебскаму індывідуальнаму прадпрымальніку — сказаць цяжка. Ужо дакладна зразумела, што яго не зарэгіструюць. Яшчэ некалькі апазіцыйных псеўдапрэтэндэнтаў таксама не сабралі патрэбнай колькасці галасоў. Можна прагназаваць, што пару з іх таксама не зарэгіструюць, а аднаго, які неаднаразова ўжо пахваліў дзейснага прэзідэнта, дакладна зарэгіструюць. Не называю тут прозвішчаў, паколькі ў гэтай выбарчай кампаніі ўжо было пару сенсацый. Ёсць версія, што нават усіх зарэгіструюць, абы распыляліся галасы пратэстнага электарату.

Пра Аляксандра Рыгоравіча тут не гаворым. Ён, як звычайна, па-за конкурсам, а таксама па-за ўсімі нормамі і правіламі. А што ж апазіцыянеры? Праўдападобна, дэмакраты і не думаюць весці паміж сабой перамовы, каб вызначыць адзінага кандыдата. А гэта менавіта тое, чаго хочуць альтэрнатыўна настроеныя людзі, рэгіянальныя актывісты. Журналісты апыталі дэмакратычных вылучэнцаў на тэму, ці лічаць яны патрэбным вызначэнне такога адзінага. Амаль усе, акрамя Аляксея Міхалевіча (які чарговы раз паказаў сябе), адказалі на пытанне станоўча. Але дзе далейшыя крокі, прапановы, ідэі? Такое ўражанне — вось сабралі актывісты для вялікіх лідараў подпісы — і цяпер можна пра іх забыцца. Прынамсі, да часу, пакуль не прыйдзе этап агітацыі. Сцвярджаю гэта таму, што ніякай актыўнасці з боку штабоў кандыдатаў па вылучэнні людзей у склад участковых камісій не назіралася. Гэтую важнейшую місію ўзялі на сябе палітычныя партыі, якія не бэсціць у нас толькі лянівы. Фармаванне камісій ніжэйшага роўню яскрава паказала, што ніякіх сур'ёзных змен па дэмакратызацыі выбарчага працэсу не адбылося. У гэтых камісіях будзе толькі 0,25 адсотка апазіцыянераў. А значыць падлік галасоў зноў будзе ісці без усялякага кантролю. І ўсе далейшыя дзеянні, у прыватнасці галасаванне, назіранне, не маюць ніякага сэнсу. Можна ўжо завяршаць удзел у псеўдавыбарах і абвяшчаць супольны байкот. Дык якая стратэгія і тактыка апазіцыі? Адна прапанова, складзеная прадстаўнікамі БХД гучыць так — рэпетыцыя пратэстнай плошчы, прызначаная на 24 лістапада. Выбар гэтай даты зыходзіць з тэрміну рэгістрацыі кандыдатаў. Але зразумела, што не можа быць у гэтым годзе ажно дзве плошчы — адна рэпетыцыя, а пасля 19 снежня ў дзень выбараў. Сур'ёзная плошча можа быць толькі адна. І ўжо зразумела, што яе ніхто не рыхтуе, прынамсі, на даны момант. Як вельмі часта ў нас бывае: слоў — на мех, а спраў — на смех. Гэтыя выбары — зноў чарговая праверка для шэрагу палітыкаў, праверка „на вашывасць”, як кажуць не зусім літаратурна. Бо ўлада ўжо даўно паказала сваё аблічча. Цяпер вось і Еўрасаюз прадэманстраваў свае рэверансы палітычнаму рэжыму ў Беларусі. Маўляў, зрабіце знешнюю лібералізацыю, „карцінку для Захаду” і мы закрыем на ўсё вочы, дамо вам новыя крэдыты і будзем весці „канструктыўны” дыялог. Таму выбары 2010 года — гэта найперш праверка палітычнай апазіцыі, ці здольная яна на сур'ёзныя самастойныя крокі.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Грыбы з цукрам

Не з'яўляюся празмерным знаўцам нашага грамадства ў яго прафесіянальным спектры. Праўда, у маім школьным часе на ўроках беларускай мовы шмат увагі адводзілася мужыкам пры вывучэнні дарэвалюцыйных тэм і калгаснікам пасля рэвалюцыі. Здаецца, што нейкая ўвага адводзілася таксама рабочым і рэвалюцыйным салдатам. Не вельмі мне вядома, ці такой увагай грамадствазнаўцаў карысталіся грыбнікі і іх подзвігі на фронце змагання за лясны ўраджай. З гэтай прычыны пакарыстаўся я зручным восеньскім сезонам і падаўся на нашу Усходнюю сцяну асабіста абследаваць справу і нават за гэтай працай папрактыкавацца.

З пасрэдным, не надта прыгодным для хвальбы ўраджаем улез я ў аўтобус прыватнай фірмы ў гарадскім напрамку. Адбылося гэта на адным з пачатковых прыпынкаў, калі яшчэ не ўсе крэслы былі заседжаны. Але зараз жа яны запоўніліся і адна мажная дама выказала незадавальненне:

— Даюць такі малы аўтобус. А не маглі даць вялікага? Дурні там сядзяць!

Апошняя ўвага датычыла, вядома, дыспетчараў. Дыспетчараў прыватнай фірмачкі, якія, магчыма, з'яўляюцца адначасна яе ўласнікамі і вадзіцелямі, а самахадаў у іх столькі, што на трасе. І дзякуючы ім менавіта, пасажыры карыстаюцца на той трасе таннейшымі праездамі ў іх і ў канкурэнцыі.

Аўтобус, быццам грыбнік грыбы, забіраў чарговых пасажыраў, станавілася цесна і нявыгадна. Падаў голас пажылы грыбнік, які сеў запозна і давялося яму ехаць стоячы:

— Пасажыру, які купляе білет, павінна быць гарантавана месца для сядзення!

Магчыма, што прылічыў ён сябе да авангарду грамадства, да нейкай прывілеяванай партыйнасці. Праўда, пры гэтым ён забыўся ўспомніць, што месцы для сядзення былі на прыпынку, з якога ён забраўся, што ён мог там сядзець і сядзець, чакаючы чарговага транспарту, які б яму такое месца гарантаваў.

Загаварылі людзі і пра фініш сваёй язды, пра тое, што невядома на якім прыпынку ў горадзе яны змогуць злезці. Сапраўды, гэта загадка, якая ўводзіць багатую разнастайнасць у манатонію тутэйшай аўтобуснай язды з беластоцкай правінцыі ў яе цэнтр. Маладым людзям можа гэтыя загвазджкі не надта істотныя, а вось пажылым грыбнікам з поўнымі грыбоў ёмістасцямі надта дакучлівыя. Але ад чаго ж людская кемлівасць?

— Усе загарадныя аўтобусы павінны спыняцца на кожным гарадскім прыпынку, — заявіла адна грыбніца.

— Але ж тады будзе на ўсіх прыпынках цесна і заблытана, — заўважыў ейны сусед.

— То няхай толькі на некаторых прыпынках спыняюцца гарадскія аўтобусы, а не на ўсіх, — адказала бравая вынаходніца.

Асмелюся заўважыць, што вышэй выказаныя ідэі зводзяцца да неўміручай і недасяжнай прагі выгады і багацця. Да казачнай мары пра транспартны чарадзейны дыван, пра харчовы чарадзейны абрус, пра іншую залатую рыбку... А ж яшчэ не так даўно гэтыя летуценствы ў выглядзе абяцальнай фразы „Ад кожнага паводле магчымасцей, кожнаму паводле патрэбнасцей” трэба было ўсур'ёз завучваць не надта ад нас адлегламу авангарду.

Але чаму ж так не атрымліваецца? Чаму абяцаны рай развейвае вецер? Нядаўна пачуў я расказ з нашай нядаўняй мінуўшчыны, як усенародны любімец Эдвард Герэк — вечная яму памяць — адкрываў цукроўню ў Лапах — ёй таксама вечная памяць. Адбывалася гэта пад юбілей 22 ліпеня, у месяцы, які нават сваёй назвай навейвае на думку ліпу. Вытворчасць цукру яшчэ не была наладжана і каб не паганьбіць урачыстай даты прывезлі яго некалькі грузавікоў з іншых заводаў і сталі сыпаць на канвееры, якія „далі прадукцыю” перад аблічча высокага госця. Славуты гаспадарнік пахваліў: „Добра сыпле” і, насаладзіўшы свае вочы, стаў саладзіць вушы мясцовым стаханаўцам. А саладзіў ён вушы шчасліваму грамадству размашыста і мясцовы актыў стаў пацець халодным потам на думку, што прывезенага цукру не хопіць на ўсю хваленую „прадукцыю”. Шчаслівенька ўдалося забраць незабыўнага таварыша Эдварда на іншы адрэзак фронту размашыстага змагання за шчаслівую будучыню.

Рай на зямлі бывае, толькі не ўсіх ён ахоплівае. Вярхушцы салодзяць вушы і вочы, возяць іх у шыкоўных машынах ці такіх жа самалётах, а ў выпадку нейкай асечкі зачараваная публіка пралівае па іх мора горкіх слёз, як калісь па прынцэсе Дыяне. А просты народ — тая ж публіка, адышоўшы ад салодкага тэлевізара, таўчэцца ў цесных аўтобусах пяшком і ў выпадку нейкай нягоды толькі паціху папаўняе горкія статыстыкі, як нядаўна каля Новага Места над Піліцай.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Дзесяць гадоў у Беластоку

З настальгіяй успамінаю апошнія дзесяць гадоў майго жыцця. Добра памятаю свае самыя доўгія канікулы 2000 года, вогнішча, якое на развітанне з даўнімі сябрамі з белліцэя сарганізаваў мой прыяцель, шчыры беларус Янка Хадакоўскі з Ягуштова. Добра памятаю як нам многім сумна было сустракацца ў гэты час, бо добра мы ведалі, што нашы дарогі разыдуцца па ўніверсітэтах усёй Польшчы. Ніхто з нас не ўсведамляў сабе як будзе выглядаць адукацыя ва ўніверсітэце, якіх сустрэнем выкладчыкаў ды новых сяброў. Новае было неразгаданае, але вельмі цікавае. Не ведаю чаму я не выбраў іншага горада ў Польшчы, толькі Беласток. Беларускую філалогію выбраў таму, што я, дзякуючы маім бацькам, здаўна жыў беларускім духам. Можа таму, што гэты горад блізка маёй роднай хаты. Сапраўды, час праходзіць вельмі хутка, а гады, так як і дні, хутка цякуць быццам вада праз пальцы будучыні.

Рашыў я жыць у студэнцкім інтэрнаце таму, што хацелася пачуць сапраўдны дух студэнцтва. Мой першы дзень у інтэрнаце па вуліцы Кракаўскай у Беластоку сапраўды быў цяжкі. На пачатку жыў я сам і моцна тужыў па роднай хаце ды непакоіўся з кім буду жыць. Потым у маім пакоі пасяліўся шчыры хлопец з Менска, які, хаця і беларус, не ведаў аніводнага беларускага слова. Гэта быў Аляксей Дзядак, які аказаўся адным з найлепшых маіх сяброў са студэнцкіх часоў. Алёша заўжды паўтараў, што дзякуючы мне не толькі навучыўся беларускай мове, але закончыў беларускую філалогію ды стаў свядомым беларусам. Добра памятаю, як мы займаліся самаадукацыяй: разам чыталі тыя ж беларускія кнігі, разам вучыліся, чыталі тыя самыя газеты, слухалі беларускі рок. Думаю, што Алёша быў адным з самых вартасных людзей, якіх я пазнаў у час вучобы. Добра памятаю, што апрача Алёшы ўжо ў першы дзень пасябраваў я са шчырым беларусам з Дамбровы-Беластоцкай Янкам Белюком. З Янкам мы часта сустракаліся на ўніверсітэцкіх калідорах, каб шчыра паразмаўляць на беларускай мове. Часта з Янкам абменьваліся беларускімі кнігамі ды касетамі. Варта згадаць таксама аднаго з найлепшых сяброў з часоў ліцэя Андрэя Красоўскага, які паступіў на расейскую філалогію і жыў у адным інтэрнаце са мной. Часта мы разам святкавалі, хадзілі на дыскатэкі.

Важным перыядам у маім студэнцкім часе было царкоўнае брацтва, членам якога стаў я ў 2001 годзе. Дзякуючы гэтай арганізацыі я пазнаёміўся з многімі вартаснымі людзьмі. Прыкладам можа быць мой сябар Сцёпа, які зараз з жонкай жыве ў Любліне. Па сённяшні дзень маем не толькі тэлефонны кантакт, але час ад часу бачымся або ў Беластоку, або ў Любліне. Да ліку маіх сяброў належыць таксама Ева Сідарчук, якая 12 сакавіка 2005 года разам са сваімі сябрамі ў клубе АЦК у Беластоку сарганізавала спектакль на мае вершы. Не сказаў бы я, што сябры з часоў белліцэя парвалі сувязі між сабою. Па сённяшні дзень утрымліваю кантакт з Янкам Хадакоўскім ды Андрэем Красоўскім. Думаю, што гэта вельмі вартасныя людзі.

Час маёй вучобы на ўніверсітэце быў моцна звязаны з беларускімі справамі, самаадукацыяй, таксама са знаёмствамі з многімі людзьмі, якія ўлівалі пазітыўную энергію ў маё маладое жыццё. У інтэрнаце я пазнаў сапраўды цікавых людзей: таленавітых пісьменнікаў, музыкаў, будучых навуковых супрацоўнікаў ды проста добрых сяброў, якім дзякую за гэты найпрыгажэйшы час у маім быцці. Хаця большасць кантактаў студэнцкіх абарвалася, то засталіся ўспаміны, якія варта захаваць для сябе на ўсе дні.

Юрка БУЙНЮК

Простыя расповеды пра каханне

Беластоцкая ратуша, 3 лістапада 2010 года, вечар...

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Анджэй Ляхоўскі і Малгажата Дмітрук

— Калі ласка, стаўце свае пытанні, — прапанавала ў пачатку сутрэчы мастачка Малгажата Дмітрук. І разгарнула вышыты ў райскія птахі і ружы ручнік, які атрымала ад сваёй бабулі Марыі Нікіцюк. Пасля гэтага паказала свой навейшы цыкл літаграфій пад загалоўкам *Кахаць* (2007). Адкрывае яго дзяўчына за кроснамі, якая тчэ паласаты ходнік у свой шлюбны *сундук*. У куфры пабачым яшчэ шытыя вышываныя кашулі, макаткі, вышываныя ручнікі...

— Макаткі, ходнікі, тканіны самной ад „заўсёды". Усе жанчыны ў нашай сям'і, і са стараны маці, і са стараны бацькі, вышывалі, шылі, рабілі на прутках. Я таксама пачала рабіць швэдрыкі ўжо ў пачатковай школе. Спачатку брала моду з журналаў, а пасля, калі тыя гатовыя ўзоры прыеліся, сама іх прыдумвала. Зараз пэўныя элементы, як хаця б паласаты ходнік, прысутныя ў многіх маіх карцінах...

У цыклі *Кахаць*, які складаецца з 20 літаграфій, асноўнай тэмай з'яўляюцца цяжарнасць і роды. Іх ахінае атмасфера вернасці, працалюбівасці, інтымнасці, прыаздобленай галубамі і квяцістымі макаткамі. У падобнай атмасферы цыклі *Тутэйшыя* (2003), *Одпуст* (2004) — пра якія мы ўжо пісалі ў „Ніве". Сугучная ім і *Паніхіда* (2006), якая кранае тэмы смерці ды ўражвае цяплом развітання з блізкім чалавекам. У мастацкім расповедзе аснову складае колер надзеі — зялёны. Сапраўды, тыя героі, якія ў *Каханні* шлюбуюць вернасць і сужонскую сумленнасць, зноў сустракаюцца ў *Паніхідзе*. У апошнім кадры бачым іх разам з маладой парачкай, якая выправілася ў далёкае падарожжа. Падарожжа, як падказвае змест, спецыфічнае — гэта мастацтва. Усе прыведзеныя загалоўкі пераклікаюцца, і дапаўняюцца, і складваюцца ў адну гісторыю. Праўда, калі глядзець на даты ўзнікнення твораў, іх храналогія не вытрымлівае паслядоўнасці. Дзякуючы гэтаму тэма далей падаецца адкрытай.

— Мне цяжка сказаць ці гэтая гісторыя будзе яшчэ разгалінаваная, — кажа Малгажата Дмітрук. — Пэўныя ўспаміны вяртаюцца і дамагаюцца, каб іх распавесці.

Героі Малгажаты Дмітрук ужо на першы погляд падаюцца нам свойскімі і знаёмымі.

— Але гэта не значыць, што іх трэба спалучаць з канкрэтнымі людзьмі ці сітуацыямі, — адзначыла мастачка. — Хацелася б большай дыстанцыі, універсальнасці.

Апошняя заўвага накіраваная ў бок нашага беластоцкага разумення свету. Тут, чамусьці, адразу шукаюць сваякоў або асабістых прызнанняў...

Чытач, мабыць, цікавы, якія пытанні ставіла беластоцкая публіка, заахвочаная да дыялогу самой мастачкай. І вось, амаль усе паўтаралі адно пытанне; пытанне датычала малапрыкметных надпісаў на многіх літаграфіях, якія на першы позірк напамінаюць комікс.

— Гэта фрагменты царкоўных малітваў, — паясняла гераіня сустрэчы.

Пытанні і адказы паказаліся патрэбнымі ды сэнсоўнымі. Дзякуючы словам паяснення, карціны, якія спачатку напаміналі комікс, сталі напамінаць малюнкі-літаграфіі са сярэднявечных святых кніг. Такі менавіта пачатак гэтага жанру!

Прэзентацыю дапоўніў фільм пра вытворчасць валёнак у Студзіводах. А на канец (фільма) дзяўчаткі з этнаграфічнага калектыву *Жэмэрва* праспявалі песню *Ой пуйду я на той ганок*. Невыпадкова напамінаем народны шэдэўр пра каханне. Гэтую песню запісалі ўдзельнікі XI Сустрэч „Зоркі" менавіта ад бабулі мастачкі, Марыі Нікіцюк, у вёсцы Мокрае каля Бельска.

Малгажата Дмітрук нарадзілася ў Бельску-Падляшскім, закончыла Бельскі беларускі ліцэй. У 1993 г. паступіла на аддзяленне дызайну Акадэміі мастацтваў у Мінску. У 1995-1999 гг. працягвала вучобу на аддзяленні дызайну Акадэміі прыгожага мастацтва ў Варшаве. У 1999 г. атрымала дыплом з узнагародай у прафесара Уладыслава Вінецкага ды мастацкі анекс у майстэрні прафесара Адама Стыкі. З 1995 г. працуе ў эксперыментальнай майстэрні прафесара Дзмітрыя Васілевіча Малаткова ў Мінску. З 2002 г. працуе асістэнтам на аддзяленні станковай графікі Акадэміі прыгожага мастацтва ў Варшаве. У 2007 г. атрымала званне доктара прыгожага мастацтва. У 2000 і 2001 гг. атрымала ўзнагароды года — Гран-пры Агульнапольскага конкурсу „Варшаўская графіка". У 2006 г. атрымала Гран-пры Агульнапольскага конкурсу імя Данеля Хадавецкага. У 2008 г. атрымала стыпендыю міністра культуры і нацыянальнай спадчыны „Młoda Polska". Выстаўляецца з 2000 г., за гэты час наладзіла за дваццаць персанальных выставак у Польшчы і за мяжой. Жыве ў Варшаве.

У „тройцы" дбаюць аб спартсменаў

Міхась СЦЕПАНЮК

— Сёння вельмі цяжка заахвоціць маладых людзей займацца спортам, бо і крышку папрацаваць трэба, і стаміцца, — кажа Васіль Ляшчынскі — дырэктар Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім.

Аднак усё-такі бельскай „тройцы" ўдаецца і шмат яе вучняў дасягае добрых вынікаў у спорце не толькі ў ваяводстве, але і ў краіне.

Пачатковая школа ды гімназія № 3 у Бельску-Падляшскім вядомыя тым, што кожны год шмат у ёй лаўрэатаў прадметных конкурсаў, карацей кажучы, гэта школы з бадай самым высокім узроўнем навучання ў горадзе. Развіваецца і мастацкая дзейнасць.

Але ў Падляшскім ваяводстве ды ў многіх кутках Польшчы школу асацыююць таксама са спартыўнымі дасягненнямі па лёгкай атлетыцы.

Здымак Яўгена Бэдэнічука

Прыкладам дасягненняў спартсменаў з „тройкі" з'яўляецца Бартэк Бэдэнічук — вучань 3 класа гімназіі, які стаў чэмпіёнам Польшчы ў скачках у вышыню ў катэгорыі 15-годкаў. 1,93 м — такую вышыню пераадолеў Бартэк у час Маладзёвага чэмпіянату Польшчы ў Торуні.

Кожнае спартыўнае дасягненне даецца цяжкай працай. Так ёсць і ў выпадку Бартка, які трэніроўкі мусіць сумяшчаць з урокамі. Як сам кажа, не заўсёды яму лёгка, паколькі пасля трэніроўкі вяртаецца дадому і робіць урокі.

— Пасля заканчэння „тройкі" хачу пайсці у Бельскі белліцэй, — кажа Бартэк.

Якраз у Бельскім белліцэі настаўнікам фізкультуры працуе бацька Бартка, Яўген Бэдэнічук. Штодзень гэта ён трэніруе маладога спартсмена.

— Трэнінгі бываюць цяжкія, залежна ад таго, якое практыкаванне загадае тата, — тлумачыць Бартэк.

Як сам адзначае, суадносіны паміж ім і бацькм крыху іншыя дома, а крыху іншыя ў час трэніроўкі.

— У хаце пра спорт гаворым менш, — тлумачыць малады спартсмен.

Дарэчы, Бартэк працягвае у нейкай ступені сямейную спартыўную традыцыю. Яўген Бэдэнічук — удзельнік Алімпійскіх гульняў у Барселоне ў 1992 годзе. У трайным скачку заняў ён тады 12 месца.

— Лічу, што ў спорце не дасягнуў я ўсяго, чаго хацелася, — кажа спадар Бэдэнічук. — Можа Бартку ўдасца дайсці вышэй.

Бартэк Бэдэнічук трэніруецца не толькі пасля заняткаў. Выязджае таксама на спартыўныя зборы, у час якіх павышае свой узровень. Дагэтуль прымаў удзел у зборах, між іншым, у Аўгустове і Шклярскай Парэмбе.

— Варта падкрэсліць, што ў спартыўных змаганнях па лёгкай атлетыцы наша школа перамагае беластоцкія школы спартыўнага профілю, — кажа дырэктар бельскай „тройкі" Васіль Ляшчынскі. — Гэта перш за ўсё заслуга настаўнікаў фізкультуры, якія шмат працуюць з вучнямі таксама пасля ўрокаў, ды саміх вучняў, якім хочацца папрацаваць.

Цікава, што ўсе свае поспехі ў спорце „тройка" дасягае, не маючы сапраўднай спартыўнай пляцоўкі. Як адзначае Васіль Ляшчынскі, хацелася б, каб вучні маглі трэніравацца на тартане. На жаль, у школы няма фінансавых сродкаў, каб правесці рамонт школьнай спартыўнай пляцоўкі. Не вельмі дапамагаюць і ўлады горада.

— Спартыўныя строі купляюць нам спонсары, — кажа дырэктар.

Як сам адзначае, падрыхтоўка вучняў да спартыўных змаганняў гэта нялёгкі працэс, паколькі зараз цяжка заахвоціць вучняў да фізічнай працы. Большасць аддае перавагу камп'ютару і інтэрнэту.

— Маладыя людзі сёння ўвесь час сядзяць перад камп'ютарам, — заўважае таксама Яўген Бэдэнічук.

А шкада, бо як тлумачыць Васіль Ляшчынскі, маладыя спартсмены гэта вельмі добрая інвестыцыя ды перш за усё прамоцыя горада ва ўсім ваяводстве і ў Польшчы. Трэба толькі ўмець заахвоціць іх да працы. І гэта прынясе вынік, як у выпадку Бартка Бэдэнічука.

На лініі „13”

19 кастрычніка г.г. ехаў я аўтобусам гарадской камунікацыі на лініі „13” у Беластоку. Перад гэтым чакаў я яго ў 14 гадзіну на прыпынку ў пачатку вуліцы Сянкевіча. Аўтобус пад’ехаў. Нумар на ім не свяціўся, а павінен! Калі я бегаў і прыглядаўся, які нумар на аўтобусе, тады мне дапамог і падказаў малады хлапец. Я ўжо і сам неяк расчытаў той нумар ззаду аўтобуса. Але ён мог і зараз ад’ехаць. Чаму б не ўставіць у акенца белую кардонку з надпісам чорнымі лічбамі: „13”?

Аўтобус у гэты раз пад’ехаў са старым разбітым рухавіком. Матор голасна гудзеў і грукатаў. Сценкі ў салоне былі пакрэмзаны. Надпісы замалёўвалі рознымі фарбамі.

Даехаў я на канцавы прыпынак „трынаццаткі” каля цяпліцы па вуліцы 27 Ліпеня. А тут даволі вялікая пачакальня-дашок са скразнякамі: дашок з плексігласу дзіравы, а са сценак выбілі 14 (!) шыбін. Лавачак тут ніхто не малюе. Як тут зімой прыйдзецца чакаць такога „свайго” аўтобуса?..

(яц)

АБ’ЯВЫ

Кафедра беларускай культуры
Філалагічны факультэт
Універсітэта ў Беластоку

запрашае на
Беларускія чацвяргі інтэрдысцыплінарны канверсаторый

праф. **Мікалай Хаўстовіч,**
мгр **Гражына Харытанюк-Міхей**

„Станіслаў Станкевіч — даследчык творчасці Адама Міцкевіча”.

18 лістапада, пачатак у 17.00,
вул. Лінярскага 3, зала 1Б

Бабіна ў „Акцэнце”

16 лістапада ў 18.00 у кавярні-кнігарні „Акцэнт” у Беластоку (Рынак Касцюшкі, 17) пачнецца сустрэча з **Наталкай Бабінай** і прамоцыя яе кнігі „Рыбін горад” у перакладзе на польскую мову. Сустрэчу павядзе Мікола Ваўранюк.

Мастацкія сустрэчы школьнікаў

адбудуцца 14.11.2010 г. у кіназале Беларускага музея ў Гайнаўцы. Пачатак у 14.00. У праграме: вершы, песні, гавэнды, інсцэніроўкі... У 15.30 зайграе гурт „Бетон”!

працяг ☞1

Бельск заслугоўвае лепшага кіравання

ная інфраструктура і гэта папраўляе камфорт жыцця жыхароў горада і яго выгляд, але гэта, на жаль, у малой ступені мае ўздзеянне на павышэнне патэнцыялу горада ў сэнсе яго развіцця. Можна таксама весці дыскусію наконт эстэтыкі горада, яго выгляду. Мне, напрыклад, не падабаецца тое, што было зроблена на ратушнай плошчы, дзе высеклі дрэвы, а замест іх пасадзілі расліннасць у вазонах. Месца, дзе расліннасць расла ў зямлі, зараз забетанаванае і пакладзена там брусчатка.

— Што б яшчэ хацелі Вы памяняць у Бельску-Падляшскім?

— Фінансаванне асветы ў Бельску з гарадскога бюджэту недастатковае, а выгляд падставовых і гімназічных школ амаль такі, які быў яшчэ некалькі дзесяткаў гадоў назад. Амаль не інвестуецца ў спартыўную школьную інфраструктуру. Гарадскія ўлады нават не збудавалі спартыўнай пляцоўкі „Орлік”. Я маю намер пабольшыць сродкі на адукцыю, бо яны звернуцца прынамсі ў два разы, а частка выпускнікоў рашыцца жыць у Бельску і будзе працаваць у карысць горада. У Бельску патрэбныя таксама большыя інвестыцыі ў культуру. Варта было б паказваць мясцовым і турыстам багатую гісторыю Бельска, Замкавую гару і тое, што было каля гарадзішча, так як гэта, напрыклад, робіцца побач Збуча на Гайнаўшчыне. Трэба было б таксама паправіць бяспечнасць у горадзе, хаця б шляхам большага маніторынгу, якога не хапае ў самых важных месцах Бельска. Калі я стану бурмістрам Бельска, маю намер падзяліцца ўладай з людзьмі з розных асяроддзяў, дзеля супольнай працы ў карысць нашага горада.

— Дзякуем за размову і жадаем поспехаў.

Гутарка з дырэктарам бельскай „тройкі” і намеснікам старшыні Рады Бельскага павета ***Васілём Ляшчынскім****, лідарам Бельскай кааліцыі ад яе заснавання ў 1994 годзе, зараз кандыдатам на павятовага раднага*

— Нядаўна святкавалася 20-годдзе самаўрадавай дзейнасці ў Бельску-Падляшскім, а Вы ўжо 20 гадоў з’яўляецеся радным, спачатку гарадскім, а пасля павятовым і ў Вас велізарны самаўрадавы вопыт. Якія шанцы мае Пётр Божка, каб стаць бурмістрам горада?

— Пётр Божка мае вялікія шанцы стаць бурмістрам Бельска. Перш за ўсё я хацеў бы звярнуць увагу на яго вялікую мабільнасць, руплівасць і дыпламатычныя здольнасці, а відаць гэта вельмі добра на падставе рэзультату яго хадайніцтва разам з войтам Пётрам Сэльвесюком у справе будовы фабрыкі „Ікеі” ў Арлянскай гміне. У гэтым самым часе ў Бельску не збудавалі ніводнага большага прадпрыемства. Пётр Божка таксама вельмі добра падрыхтаваны да кіравання горадам — у яго вопыт не толькі працы ў самаўрадавай адміністрацыі, бо раней працаваў ён віцэ-дырэктарам бельскай бальніцы. Важна, што Пётр Божка — чалавек малады, адкрыты на свет. Нам патрэбны такі бурмістр, які ўмеў бы сцягнуць капітал і пабольшыць гаспадарчы патэнцыял Бельска.

— Галоўныя козыры Бельскай кааліцыі гэта вялікі вопыт і вялікія поспехі ў самаўрадавай дзейнасці. Чым яшчэ хочаце заахвоціць бяльшчан, каб прагаласавалі за кандыдатаў вашай кааліцыі?

— Зараз у Бельску так правяць, што за апошнія гады ў горадзе колькасць насельніцтва паменшала прыблізна на 2 тысячы чалавек. Мы хочам сцягваць вонкавы капітал, ствараць новыя месцы працы і даваць прапановы маладым людзям, каб засноўвалі сем’і і аставаліся жыць у Бельску. Мы блізка Беларусі і недалёка ад Расіі. Трэба было б выкарыстаць гэтае распалажэнне Бельска і прыцягнуць да нас прадпрыемствы, якія схацелі б зрабіць скачок на ўсходні рынак. Хочам мы таксама стварыць лепшыя адукацыйныя магчымасці, бо зараз дыдактычная база ў Бельску даволі мізэрная. Цяпер увогуле няма ў нашым горадзе дзіцячых ясляў, а толькі ясельныя аддзяленні ў садках. Дзіцячыя садкі цяпер перапоўненыя і трэба павялічваць колькасць месц у іх або адчыняць некаторыя з 4 закрытых у Бельску прадшколляў. Важная справа ў Бельску і нашым павеце — дбанне пра беларускае школьніцтва. Наша „тройка” прэзентуе высокі ўзровень навучання, найвышэйшы ў Бельску, Бельскім павеце і можа спаборнічаць з найлепшымі школамі ў Падляшскім ваяводстве, але патрэбныя большыя сродкі на адукацыйныя патрэбы ў гарадскіх школах.

фота Аляксея МАРОЗА

Бельская кааліцыя *была заснавана ў 1994 годзе Беларускім камітэтам, Украінскім камітэтам і прадстаўнікамі СЛД. У такім саставе правіла яна ў Бельску-Падляшскім 8 гадоў, а бурмістрам быў тады яе прадстаўнік Андрэй Сцепанюк, зараз дырэктар Бельскага белліцэя. У 2002 годзе з кааліцыі выступіла СЛД і ад гэтага часу належалі да яе і належаць беспартыйныя беларусы, украінцы і палякі. Зараз кандыдатам БК на бурмістра Бельска з’яўляецца віцэ-стараста Бельскага павета Пётр Божка, а кандыдатам на войта Арлянскай гміны — зараз правячы там Пётр Сэльвесюк, які ў змаганні за кіруючую ў гміне пасаду не мае контркандыдата. Лідарамі на спіску кандыдатаў на павятовых радных ад Бельскай кааліцыі ў горадзе Бельск з’яўляюцца віцэ-стараста Пётр Божка, дырэктар бельскай „тройкі” і віцэ-старшыня Рады Бельскага павета Васіль Ляшчынскі, дырэктар Бельскага дома культуры і мастацкі кіраўнік „Маланкі” Сяргей Лукашук, старшыня Фонду Дамоў праваслаўнай культуры Варшаўска-Бельскай епархіі Ірына Лазовік і арлянскі войт Пётр Сэльвесюк. У акрузе з Арлянскай гмінай лідарам кандыдатаў у павятовую раду з’яўляецца працаўнік тамашняй Гміннай управы, дзеяч добраахвотнай пажарнай аховы і член управы Бельскага павета Міраслаў Бало, а ў акрузе з Бельскай вясковай гмінай першынство на спіску БК мае прадпрымальнік і былы войт гэтай гміны Юрый Ігнацюк.*

У Бельску-Падляшскім у чатырох акругах першыя месцы на спісках Бельскай кааліцыі на гарадскіх радных займаюць Андрэй Рошчанка (акруга № 1) — былы шматгадовы дырэктар Комплексу будаўнічых школ у Бельску, Ала Сасна-Паўлючук (акруга № 2) — лекар педыятр, спецыяліст па сямейнай медыцыне, уласнік Непублічнай ўстановы медыцынскай сямейнай апекі „Medica” ў Бельску, Ігар Лукашук (акруга № 3) — настаўнік у Комплексе школ у Ягуштове, намеснік старшыні Звязу беларускай моладзі, ініцыятар і стваральнік Цэнтра адукацыі і прамоцыі беларускай культуры ў Шчытах, Дарафей Фіёнік (акруга № 4) — гісторык і фальклярыст, аўтар і сааўтар гістарычных і краязнаўчых кніжак, стваральнік Музея малой айчыны ў Студзіводах і арганізатар фестывалю „Там по маёвуй росі” і „Олень по бору ходіт”.

— Бельская кааліцыя хіба найдаўжэй дзейнічае ў Бельску сярод камітэтаў, якія прымаюць удзел у сёлетніх самаўрадавых выбарах?

— Бельская кааліцыя жыве ў свядомасці бяльшчан ужо 16 гадоў. У апошнім скліканні Гарадской рады нашы кандыдаты саставілі самую вялікую колькасць радных, у параўнанні да іншых выбарчых камітэтаў. Андрэй Сцепанюк быў бурмістрам Бельска, Юрый Ігнацюк — войтам Бельскай гміны, Пётр Сэльвесюк — стаў войтам Арлянскай гміны, а Пётр Божка ўжо два тэрміны працуе віцэ-старастам Бельскага павета. Калі ў 2002 годзе СЛД запатрабавала, каб мы выступілі пад іх шыльдай, мы амовіліся ад партыйнай палітыкі, бо Бельская кааліцыя гэта аб’яднанне людзей вольных ад партыйных ідэалогій. Мы хочам будаваць у Бельску і Бельскім павеце грамадскую супольнасць, каб кожны наш жыхар адчуваў сябе важным чалавекам, які можа мець рэальнае ўздзеянне на жыццё ў сваім наваколлі.

— Дзякуем і жадаем поспехаў.

Гутарыў Аляксей МАРОЗ

ПАДРЫХТАВАЎ ДУХОВЫ ПАДМУРАК!

Ганна КАНДРАЦЮК

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Гражына Харытанюк-Міхей на фоне вёскі Чаромха

Калі думаем пра Беларускі музей у Гайнаўцы, думаем пра Кастуся Майсеню. Яго асоба ўжо ўганараваная мемарыяльнай дошкай у сярэдзіне будынка. Ніхто не мае сумненняў наконт ролі і значэння вялікага будаўніка і беларуса-адраджэнца. Мала аднак хто ў нас ведае і памятае пра заслугі ў гэтай справе этнографа-адраджэнца Марыяна Пецюкевіча. Можна сказаць, што падрыхтаваў ён духовы падмурак пад гэтую ўстанову. Ды як паказваюць крыніцы, заразіў ён музейнай справай інжынера-эканаміста Кастуся Майсеню. Этнаграфічныя нарысы Марыяна Пецюкевіча, мабыць, памятаюць яшчэ найстарэйшыя чытачы „Нівы"; друкаваліся яны на працягу 60-х і 70-х гадоў XX ст. Каштоўныя і ўнікальныя допісы з Сакольшчыны і Гайнаўшчыны (са здымкамі) чакаюць сваіх даследчыкаў і манаграфій. У 1963 годзе Марыян Пецюкевіч пісаў журналісту нашага тыднёвіка Мацею Канапацкаму: *(...) Па прыездзе ў Польшчу я быў адным з першых, якія забіралі голас у „Ніве" аб патрэбе, а нават неабходнасці арганізаваць беларускі этнаграфічны музей на Беласточчыне. Я, як этнограф-музеялог, можа больш чым хто іншы душою хварэю над тым, што на нашых вачох беспаваротна гінуць помнікі беларускай народнай культуры, якія мы, этнографы, назвалі жывымі гістарычнымі дакументамі. Дзякуючы Кастусю Майсеню і іншым гэтая справа была пастаўлена на парадак IVЗ'езда* [БГКТ — аўт.]. *А як першы крок да ажыццяўлення з'ездаўскай пастановы „Ніва" апублікавала заклік да беларускага грамадства, каб яно прымала ўдзел у збіранні музейных экспанатаў (...).**

Прапановы Марыяна Пецюкевіча не заўсёды сутракаліся з прыхільным водгукам дзеячаў БГКТ. Магчыма, насцярожвалі патрабавані навукоўца-прафесіянала. Ён даказваў, што музеі павінны выконваць ролю ўніверсітэтаў, быць паўнавартаснымі навуковымі ўстановамі, а не *складамі ўсялякага смецця*.

— Гаварыў, што беларускі музей павінен узнікнуць у Беластоку, а не ў Гайнаўцы, — кажа магістр Гражына Харытанюк-Міхей.

Спадчына Марыяна Пецюкевіча паслужыла даследчыцы ў яе доктарскай дысертацыі на тэму дзядоўскіх абрадаў у польскай рамантычнай літаратуры. 20 кастрычніка г.г. Гражына Харытанюк-Міхей змястоўна і цёпла прыблізіла асобу Марыяна Пецюкевіча публіцы, што сабралася ў беластоцкай ратушы. Сустрэчу папярэдзіла адкрыццё выстаўкі пад загалоўкам *Між Вільняй і Торунню* (працуе да канца лістапада). На ёй



Марыян Пецюкевіч

пабачым шмат *торуньскіх* фатаграфій і прадметаў матэрыяльнай культуры, сабраных Марыянам Пецюкевічам у час беластоцкіх экспедыцый. „Пры чым тут Торунь?" — падумае чытач. Марыян Пецюкевіч у 1959-1970 гадах працаваў у Этнаграфічным музеі ў Торуні. Дзякуючы гэтай установе, якой кіравала незаменная прафесар Марыя Знамяроўска-Прыфярова, былі ладжаны навуковыя экспедыцыі на Сакольшчыну і Гайнаўшчыну. Марыян Пецюкевіч як ніхто разумеў значэнне сваёй місіі. З сённяшняй перспектывы наш свет у 1960-я гады напамінаў жывы запаведнік.

*Марыян Пецюкевіч нарадзіўся 24 верасня 1904 года ў вёсцы Цяцеркі на Браслаўшчыне. Закончыў Віленскую беларускую гімназію. У сваіх Цяцерках залажыў філіял Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры (1926 г.). Працаваў у беларускай „Крыніцы", быў галоўным рэдактарам „Шляху моладзі" і членам калегіі „Калосся". Пісаў артыкулы, прысвечаныя беларускай гісторыі, этнаграфіі, краязнаўству, пісаў вершы і казкі (пад псеўданімам Дзед Марцін). У 1938 г. абараніў магістэрскую дысертацыю на тэму прымітыўнай культуры стараабрадаўцаў. З 1931 г. працаваў у Навукова-даследніцкім інстытуце Усходняй Еўропы. Дадаткова выконваў шмат іншых функцый, быў, напрыклад, дырэктарам Віленскага беларускага музея. У час апошняй вайны працаваў інспектарам асветы ў Ашмянах. За сваю нацыянальна-грамадскую дзейнасць быў праследаваны польскімі і бальшавіцкімі ўладамі. У 1949 г. разам з сям'ёй быў сасланы ў Сібір (пасёлак Ужур Краснаярскага краю) а з 1953 г. па 1956 г. адбываў пакаранне ў Варкуце. * **

Хацелася б шырэй асветліць асобу этнографа-першапраходца беларускай Беласточчыны. Пэўныя крокі пачынілі ўжо сябры Беларускага гістарычнага таварыства (у прыватнасці доктар Лена Глагоўская і магістр Вячаслаў Харужы). У 2001 і 2005 гадах былі імі выдадзены сібірскія ўспаміны і лісты М. Пецюкевіча. Віленскае Таварыства беларускай культуры „Рунь" выдала ў сваю чаргу аўтабіяграфічныя кніжкі „У пошуках зачараваных скарбаў" і „Падарожжа ў Рым". Гэтыя каштоўныя і цікавыя крыніцы (таксама з-за літаратурнага таленту М. Пецюкевіча) варта прапанаваць ліцэістам і студэнтам, як і старэйшым гімназістам. На іх аснове можна падрыхтаваць цыкл лекцый пра няслушна прызабытага Марыяна Пецюкевіча і тым самым паказаць у чым сакрэты і ісціна модная і папулярнай сярод нашых грантасосаў этнаграфіі.

Рынак у Саколцы, пачатак 1960-х гадоў

КРЫНІЦЫ:

** Ліст Мацею Канапацкаму, Торунь 27.IX.1963 г.*

** * Біяграфія паводле прадмовы да „Лістоў (1956-1982)"*

Дзень сеніёра

Гэтая цыклічная імпрэза штогод арганізуецца Гміннай управай у Чаромсе. Сёлета Дзень сеніёра адзначылі 24 кастрычніка. У мясцовым Гмінным асяродку культуры сабралася шмат пенсіянераў з Чаромхі-Станцыі ды навакольных вёсак: Чаромхі-Вёскі, Вулькі-Тэрахоўскай, Кузавы, Ставішчаў, Баброўкі, Зубачоў, Пагулянкі, а нават з адлеглай Дабрывады Кляшчэлеўскай гміны. У мерапрыемстве ўдзельнічалі кіраўнікі гміннага самаўрада, праваслаўны і каталіцкі святары, ды спонсары — старшыні прафсаюзных арганізацый Прадпрыемства чыгуначнага рухомага саставу з Чаромхі-Станцыі. Сярод гэтых апошніх упершыню не хапіла лідара гміннай арганізацыі Саюза пенсіянераў Юзэфа Дубковіча і прадстаўніка Ваяводскага праўлення Саюза польскіх пенсіянераў і інвалідаў.

Мерапрыемства пачалося з выступлення войта Міхала Врублеўскага, які напомніў традыцыю арганізавання Дня сеніёра ў чыгуначнай Чаромсе, затым старшыня Рады гміны Надзея Суліма пажадала юбілярам з нагоды іхняга свята моцнага здароўя, поспехаў у сямейным жыцці і... вясёлай забавы. Музыканты ў гэты час выканалі разам з публікай „Сто лят" і „Многае лета". Перад пачастункам, які падрыхтавалі працаўнікі Гміннага асяродка сацыяльнай дапамогі, прысутныя згаварылі малітву. З мастацкай часткай выступілі мясцовыя гімназісты, якія напомнілі гісторыю чаромхаўскай адукацыі. Да танца падыгрываў гурт „Wojaky". У перапынках выконваліся песні вядомыя ў навакольных вёсках, а запявалам быў Грыша Бацюк з Чаромхі-Вёскі, хоць і апошнія ўдзельнікі не заставаліся ззаду. Пры застоллі, як і ў танцы, царыла сямейная, жыццярадасная атмасфера. Сёлетнюю імпрэзу лічу ўдалай. Заслуга гэта арганізатараў і спонсараў. Дзякуй ім за гэта!

Стоп псіхатропным рэчывам!

У палове кастрычніка Павятовая камендатура паліцыі ў Гайнаўцы супольна з Гарадской камісіяй супрацьдзеяння алкагалізму ладзілі сустрэчы з вучнямі гімназій і сярэдніх школ пад лозунгам „Стоп псіхатропным рэчывам!". У час сустрэчы закраналіся пытанні шкоднасці спажывання алкаголю, наркатычных сродкаў, у тым ліку г.зв. „дапалячаў", а таксама юрыдычнай адукацыі школьнага асяроддзя. Апрача таго моладзь знаёмілася з пытаннямі бяспечнага карыстання інтэрнэтам з улікам праблемы кібернасілля. Арганізатары сустрэч уручылі моладзі адмысловыя лістоўкі з адпаведнай для гэтай мэты інфармацыяй.

Уладзімір СІДАРУК

Зорка
для дзяцей і моладзі

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

Мы таксама еўрапейцы

Гімназісты з Гарадка

Наталька Паплаўская

У апошні час амаль кожная школа адзначае Дзень еўрапейскіх моў. І звычайна ў цэнтры падзей знаходзіцца тады англійская мова. У Залуках усе школьнікі вывучаюць англійскую мову, аднак галоўнай мовай у еўрапейскі дзень была... беларуская. З гэтай нагоды школу наведала прыгожая кампанія з Гарадка. Гімназісты, бо аб іх мова, прыехалі з беларускай пастаноўкай пад загалоўкам *Як муж жонку перастаў слухаць*. Свой спектакль упрыгожылі яны песнямі, якія спявае сучасная Гарадочына (*Купалінка; Ой, у полі два дубкі; Касіў Ясь канюшыну*). Як не цікава, самай папулярнай песняй у гэтай ваколіцы (як і пад Саколкай) з'яўляецца падляшскі шэдэўр *Ой, у полі два дубочкі, мілы мой міленькі...* Песню спяваюць па ролях; карацей кажучы, дзяўчаткі ставяць прыкольныя пытанні тыпу: *Дзе ж ты мяне пахаваеш, мілы мой міленькі*, а хлопцы заўсёды маюць гумарыстычны адказ: *За хлявом міла, за хлявом...*

Песня, мабыць, падабаецца і таму, што стварае магчымасць імправізацыі. Калі ў кампаніі жартаўнікі, яны на хаду прыдумваюць падобныя пытанні, а іх музычныя саперніцы вокамгненна прыдумваюць адказ. Такім чынам песня можа цягнуцца і весяліць, аж стоміць.

Варта дадаць, што палову гарадоцкіх акцёраў складалі нядаўнія выпускнікі школы ў Залуках. З гэтай, ды не толькі з гэтай прычыны іх сустракалі як блізкіх ды дарагіх гасцей, якія не абмінаюць родных парогаў. У Залуках адчуваецца свайго роду лакальны патрыятызм. Малыя і дарослыя ладзяць супольныя святы. Вось і сёння, калі на сцэне паказалася іх Наталька Паплаўская (зараз гімназістка, іграла вяскоўца Васю), наймалодшыя клікалі яе *Чараўніца*. Такой менавіта запамяталася яна ў час апошняга Купалля, якое шумна святкуюць у Залуках. Наталька іграла тады Чараўніцу ў іх пастаноўцы *Пра Пілінку і папараць-кветку*. Спектакль, паводле народных казак, напісала іх любімая настаўніца Альжбета Раманчук. Сёння таксама яна прывезла сваіх гімназістаў з Гарадка ў сваю пачатковую школу ў Залуках. Свята прымеркавалі якраз да прыезду „Зоркі" 27 кастрычніка г.г. Мы ўсе глядзелі з захапленнем на гарадоцкіх акцёрак і акцёраў. Малайчыны!

ЗОРКА

Клаўдзія Каліна

Зімовы дуб

Ідзе лесам Лістапад, лісце сыплецца, як град, сякуць дажджы касыя, шумяць вятрыскі злыя... Дрэвы нізка кланяюцца Лістападу, сцелюць да яго ног пажоўклае лісце. Адляцелі ў вырай птушкі, звяры пахаваліся ў зацішак, апусцелі палі. Задаволены Лістапад: усё скарылася яму. Усміхнуўся, паслаў на зямлю сонечны промень, глянуў з-за шэрых хмар лапінкай блакіту. Але што гэта? Вунь на ўзлессі раскінуў вецце магутны Дуб, увесь у медзяной лістоце.

— Чаму ты не скарыўся мне? — грозна спытаў Лістапад.

— Я — зімовы. Таму да вясны буду ў медзяным убранні.

Угневаўся Лістапад.

— Гэй, вятры буйныя! — паклікаў ён сваіх памочнікаў. — Сарвіце з Дуба яго медзяны ўбор!

Завылі вятры. Зашумелі галіны Дуба.

— Гэй, дажджы халодныя! — гукнуў Лістапад. — Пазбівайце з Дуба лісце.

Секнулі дажджы, забарабанілі па буйным лісці, але Дуб не зварухнуўся.

— Гэй, браце Снежань, — загукаў Лістапад. — Прышлі мне марозу пякучага, завеяў сыпучых, няхай замарозяць, засыплюць снегам непакорнага!

Прымчалі маразы, прыляцелі завеі, марозілі, снегам секлі, але не скарыўся Дуб. Спахмурнеў Лістапад і адступіўся ад цара лесу... Усю зіму стаіць Дуб у сваім медзяным адзенні. Толькі вясною ненадоўга скідае яго, каб пераапрануцца ў новае, зялёнае. За гэта называюць яго Зімовым дубам.

Галерэя ЗОРКІ

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

1. Імя і прозвішча: Оля Рагоза (II клас ПШ у Орлі).

2. Твой любімы прадмет: беларуская мова.

3. У жыцці хачу стаць: касметолагам (таму што мая цёця Марыся — касметолаг).

4. У сяброў цаню: калі магу разлічваць на іх дапамогу.

5. Не люблю: дурных паводзін і маны.

6. Па-беларуску размаўляю: з сястрой, мамай і татам, дзедам.

7. Кніжка, якая мяне захапіла: «Вершы Натальцы» Віктара Шведа.

8. Падабаецца мне музыка: беларускія народныя песні.

9. Твае ўлюбёныя стравы: кебаб і салаткі.

10. Ці ёсць у цябе любімы спосаб адпачынку? Так, я люблю пажартаваць з сястрой.

11. Калі дарасту, хачу жыць: у Варшаве, бо там ёсць Сейм.

Замена з бабрамі на зубы

(казка іракезскага племя канекэ)

Цікава як пераплятаюцца міфы і казкі далёкіх народаў. Мы, жыхары Падляшша, таксама маем мноства прыгабытых легенд, часам ад іх памятаем адзін сказ ці прыговорку. Напрыклад, калі ў дзіцяці выпадаў першы малочны зуб, падляшы-беларусы кідалі яго ў прыпечак ды гаварылі такія словы: *Мышка-мышка, на тобіэ зубіка косцяного, прынэсі мніэ золотого!* Нядаўна я натрапіла на блізнячую легенду на ўсходнім памежжы ЗША і Канады ў Паўночнай Амерыцы. Легенда належыць індзейскаму племеню *канекэ*, што па-іхняму значыць: народ крэменю (па-англійску іх завуць Mohawk). Прыналежаць яны індзейскай сям'і іракезаў, вядомых як таленавітыя і бязлітасныя ваяўнікі. Што цікава, уладу ў іхняй грамадзе трымаюць жанчыны. І вось даўным-даўно, калі людзі і звяры добра разумелі сваю мову, *канекэ* папрасілі ў баброў, каб памяняцца з імі зубамі. Як вядома, у гэтых звяркоў простыя ды надзвычай моцныя зубы. Спачатку, не абдумаўшы дэталёва справы, бабры згадзіліся з прапановай людзей. Тыя паабяцаліся даглядаць іх хаткі на вадзе і аддаваць ім малочныя зубы, якія губілі дзеці. Найбольш цэнны быў першы зуб. Яго кідалі ў ваду, прымаўляючы: *Бабёрык-браток, на табе малочны зубок, вазьмі касцяного-малога, прынясі шырокага крэмянога!*

Спачатку бабры ахвотна мяняліся з людзьмі, але з-за гэтай здзелкі іх жыццё адмянілася. Яны не патрапілі нам ды французам. Праўда, жывуць яшчэ такія *канекэ*, якія вераць у моц першага абяцання баброў. Сёння сярод індзейцаў гэтага племя можна сустрэць матуль, якія ідуць да ракі з першым малочным зубком дзіцяці, якія ласкава прымаўляюць-заклінаюць: *Бабёрык-браток, на табе малочны зубок, вазьмі касцяного-малога, прынясі шырокага крэмянога!*

Яны вераць, што такім чынам наклічуць здароўе і сілу дзіцяці. Нашы беларусы-падляшы разлічваюць яшчэ і на багацце, таму просяць залатых зубоў!

ЗОРКА

PS. Народ *канекэ* пачаткова жыў у доўгіх дамах-вагонах на пяцьдзесят чалавек. У такой хаце змяшчалася прыблізна пяць сем'яў. Гаспадаркай займаліся жанчыны, якія вырошчвалі дыні, фасолю, сланечнікі, даглядалі дзяцей і лекавалі хворых. Мужчыны ў сваю чаргу адпраўляліся на паляванні і хадзілі з вайной на суседнія плямёны, адкуль кралі жанчын і дзяцей. *Канекэ* мелі сваё пісьмо *wampum*, дзе інфармацыя была запісана ўзорамі з каралікаў.

Вершы Міры ЛУКШЫ

Ірыней

Ірынней з Віхром б'ялявым
— ён ахвотнік да забавы.
Толькі вока ён расплюшчыць,
голаў падыме з падушкі,
рвецца ён да жартаў-гуляў
яшчэ ў начной кашулі.
Мчыцца, носіцца па доме,
спаць не дасць ужо нікому,
зачапае ўсё жывое,
ці старое, ці малое,
і прадметам не даруе,
што паломіць і зруйнуе...
— Ірынней, не дурэй!
Ірынней, не шалей!
Перш падумай, за што брацца!
Не буры парадку ў хатцы!
Ды натура вось такая
ў Ірынея Віхравая.
— Выпі мятную гарбатку!
Пасядзі пры маме, татку!
Мятка Ірка супакоіць?
Зноў памчаўся па пакоях!
Аж спыніўся і маўчыць,
на вуаліка глядзіць,
у акварыум зялёны,
што паставілі ў салоне.
Побач з ім — і Манька-кошка.
Пасядзелі разам трошкі.
У вочы рыбцы паглядзелі,
з одумам — паспакайнелі!

Музыка з кайфам

Новая праўда ад „Нейра Дзюбеля"

У Мінск ад нас далёка, але калі хтосьці вельмі моцна цікавіцца музычнымі падзеямі беларускай сцэны (бо ў нас на Падляшшы яна сціпленькая), то, на жаль, трэба яму змірыцца з фактам, што ўсё важнае ў музыцы адбываецца менавіта там. Мінскія гурты ў нашых падляшскіх слухачоў маюць паважанне і вялікі фан-клуб, а сярод тых, якіх нецярпліва чакаюць у Беластоку, знаходзіцца хаця б „Серебряная свадьба", „Гурзуф", „IQ 48" ці... „Нейра Дзюбель". І вось сёння прыпынімся на „Дзюбелях".

Пра іх новы альбом яшчэ зашмат не пішацца, дык і прачытаць няма як. А паслухаць? Трэба пачакаць, хаця 2-3 песні кружаць ужо па інтэрнэце. Важнае, што яны на беларускай мове. Цешуся, бо хаця беларускасці „Нейра Дзюбеля" аспрэчваць не прыходзіцца, то ўсё ж такі расійскамоўныя песні ў іх творчасці паяўляюцца. Гэта генетычна сядзіць у гурце і, дарэчы, яно натуральнае. Але кожны раз, калі рыхтуецца новы альбом, хвалююся, што можа малавата будзе ў ім беларускай мовы. Апошні альбом „Stasi" быў перш за ўсё беларускамоўным і найкаштоўнейшым можна яго пракаментаваць словам „cool".

Ужо 11 лістапада можна будзе паслухаць новы-навюсенькі альбом „Дзюбеляў". У мінскім клубе „Рэактар", амаль роўненька тры гады пасля прэм'еры „Stasi", адбудзецца прэзентацыя дыска „Афтары правды". Мясцовыя крытыкі зацірають рукі, бо — паводле іх — гэта будзе выхад з заняпаду (ці вы падумалі б, што „НД" у заняпадзе???). Ёсць пэўна і зярняты ПРАЎДЫ ў тым, бо атмасфера новага альбома бліжэйшая ранняй творчасці гурту. Але ці называць гэта заняпадам? Хутчэй за ўсё гурт мае за сабой такі ці іншы творчы перыяд. Над прычынамі не будзем задумвацца, бо для нас найважнейшыя музычныя эфекты. Альбомам „Танкі" і „Stasi" характэрны свой стыль. Зараз „НД" прапануе панк-рокавы дыск, менш „рамштайнавы", які для рок-слухачоў напэўна стане гітам.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 46

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 42:

Жыла, жар, Іра, фота, рад, карал, жураўлі, сын, як, хатка, кола. Ах, жарт, куст, шарык, ранак, жораў, Наталля, рад, ікра.

Узнагароды, **кампакт-дыскі з беларускай музыкай**, выйгралі: **Патрык Сасна, Павел Кучынскі, Паўліна Казімірук, Эвеліна Саснюк, Магдалена Міхалевіч, Мартына Швед, Наталля Тамчук, Дыяна Галёнка, Вілета Дработка, Кася Дзержаноўская, Магдалена Ваўранюк, Вікторыя Артэмюк** з Бельска-Падляшскага ды **Рафал Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



Арыгінальныя ўязныя вароты

Турысты, што наведваюць Белавежу, цікавяцца не толькі адной прыродай. Ім цікава і арыгінальная, даўняя тутэйшая архітэктура, якую, на жаль, выцясняе новае будаўніцтва. Шмат прыезджых, шпацыруючы вуліцамі мястэчка, затрымліваецца на вуліцы Трапінка, ля дома № 119. Іх увагу прыцягваюць арыгінальныя ўязныя вароты. Гэта адзіны такі помнік старадаўнасці на Белавежскай паляне.

Вароты былі збудаваны ў міжваенны перыяд, праўдападобна ў 1920-я гады. Мабыць, даўнія ўласнікі пляца на Трапінцы ідэю і ўзор варот прывезлі з бежанства, значыць, з прымусовай эміграцыі 1915-1922 гадоў, з тэрыторыі ўсходняй Беларусі або заходняй Расіі. У Белавежы такіх уязных варот ніхто дагэтуль не будаваў. Зрэшты, гэтая ідэя не знайшла пераемнікаў сярод астатніх жыхароў. Хаця і ў міжваенны перыяд, а таксама ў другой палове XX стагоддзя ў Белавежы збудавана некалькі ўязных варот да публічных аб'ектаў, але зусім у іншым стылі.

Вароты некалькі разоў рамантаваліся, апошнім разам у 1986 годзе. Тады выканаўцам прац быў мясцовы рамеснік Аляксандр Бушко, а дапамагаў яму сын Андрэй.

Цікавы і сам драўляны жылы дом, што знаходзіцца на пляцы побач варот. У каталогу „Zabytki architektury i budownictwa

Уязныя вароты ў другой палове 1960-х гадоў. Фота Януша Б. Фалінскага

w Polsce. T. 3. Województwo białostockie" (Варшава 1992) падаецца, што быў ён збудаваны пад канец 1930-х гадоў. Будынак, праўда, свайго першапачатковага выгляду да нашага часу не захаваў, але надалей астаецца цікавым прыкладам даўняга, падляшскга драўлянага будаўніцтва. У міжваенны перыяд у гэтым доме жыла сям'я Цэлеяў. У 1930-я гады змяшчалася тут таксама яўрэйская прадуктовая крама. Пасля вайны ўласнікамі і жыхарамі дома была сям'я Каліноўскіх, потым Валянціна і Раман Альшэўскія. Зараз дом з'яўляецца ўласнасцю Іаанны і Анатоля Леўчукоў, якія вядуць у ім агратурыстычную кватэру „Na Skraju" („На краю").

Пётр БАЙКО

Алесь БАРСКІ

Аднавясковым паэтам

Нелірычнымі быць мы не можам,
Лёсы чулыя душы прынеслі.
Знаходзім натхненне ў збожжы,
У казцы вясковай і песні.

У зорным начным трапятанні,
У гомане нарвенскіх водаў,
У смутку апошніх расстанняў
У радасці летніх усходаў.

У ціхіх напевах гармоні,
У птушак адлёце, прылёце,
У поціску шчырым далоні,
У бацькаўскай працы і поце.

У таямнічасці заячых сцежак,
У ясным шляху пакаленняў,
У песні старой Белавежы
Чэрпаем лірычнасць натхнення.

Ад пастушка да рахункавода

Расказ Дзям'яна СВЕНТАХОЎСКАГА, народжанага ў 1931 годзе ў Зубаве (ч. 2)

(працяг з 45 н-ра)

Саветы білі па Зубаве, адну кабету ранілі і яна ад ран, ад заражэння памерла. І каня аднаго саветы забілі, і пеўня. Рускі самалёт скінуў бомбу на нямецкія гарматы, адну разбіў; прыехала санітарная машына і неўзабаве батарэю знялі.

Нямецкія танкі з павернутымі назад дуламі адступілі з Зубава ў шэсць гадзін раніцы. Дзед наш начаваў у вёсцы, на досвітку з'явіліся савецкія разведчыкі, дзед злякаўся.

— Хозяин, это мы, свои. Немцы есть?

— Есть.

— Много?

— Много.

Недзе ў дзевяць гадзін раніцы з'явіліся ў вёсцы рускія коннікі, па танкавых слядах ехалі. Пытаюць дзеда:

— Фрыц есть?

— Нет.

Рускіх пехацінцаў з'явілася многа, як мошак. Вечарам хадзілі па вёсцы, збіралі яйкі, сала, танцавалі, спявалі, паставілі радыёпрыёмнік і частушак слухалі. То і мы сходзіліся паслухаць.

Нашу хату заняў нейкі штаб і вартаўнік нас у хату не пускаў. Перад фронтам дзед з бабай павымалі з хаты вокны і аканіцы зачынілі. Гаварылі: як згарыць хата, то хаця вокны астануцца; але ў вайну ў Зубаве нічога не згарэла. А саветы загадалі вокны ўставіць. Нас дахаты не пускалі некалькі дзён, пакуль тут фронт стаяў.

У Кнаразах у час вайны жылі савецкія акушэрка і медсястра, што ў 1941 годзе не ўспелі адступіць з фронтам. І цяпер, у час савецкага наступлення, тая медсястра загінула. Ляжыць яна на покуці, людзі плачуць, што васточніцу забілі. Адзін з байцоў распытаўся пра пакойніцу і сказаў, што гэта ягоная сястра, хацеў астацца ў Кнаразах. Аднак камандзір не дазволіў, толькі загадаў ісці ў Рыпнева, а адтуль адпусціў. Пакойніца ляжала ў туфлях і той брат сказаў, каб іх зняць, але людзі не згадзіліся. Напісаў ён паведамленне да сваёй сям'і, а адтуль прыслалі пісьмо з запытаннем, як яе пахавалі. Тутэйшыя людзі пабаяліся ў Расію пісаць, што пахавалі яе з бацюшкам, дык напісалі адно, што паводле нашага абычаю...

Лёгка раненыя салдаты-аздаравенцы вярталіся з тылавых шпіталяў на фронт; іх не везлі, яны ішлі самі. Яны заходзілі ў вёскі на начлег і пры нагодзе дапамагалі ў палявых работах. Вось у нас такія два байцы самі папрасіліся папрацаваць і цэлы дзень сярпамі авёс у нас жалі. На дарогу тата даў ім саланіны з хлебам. Адзін з іх да вайны служыў у Беластоку, ваяваў пад Масквой і зноў тут апынуўся. Гаварыў ён, што так ужо надаела яму ваяваць, што хіба лягчэй было б, каб яго забілі. Хваляваліся яны, што на Польшчы не дагаворацца, аднак адзін суцяшаўся, што крыху па-польску ўмее. Было ім недзе пад сорак гадоў. А малодшыя аздаравенцы да работы не рваліся, толькі яек па вёсцы шукалі.

Пасля вайны тут банда сямейная з Гацькоў і Райска хадзіла, рабавалі людзей, у аднаго паршука забралі. І ў нас былі; баба хацела засвяціць, то па руках ударылі. Пасля вёску вартавалі. Чуваць было часам то там, то сям страляніну. І як насталі ўбоўцы, то тую банду палавілі, пасудзілі. Банда ружжо ў лесе трымала, у густых кронах дрэў. Спярша не хацелі марадзёры паказаць свайго сховішча, яле як ім убоўцы ўсыпалі, то прызналіся і паказалі.

Элемент хаты ў Зубаве

З Зубава пасля вайны выехала ў СССР каля васьмі сем'яў, слабейшых гаспадароў; адзін меў нават дванаццаць гектараў, але слабой зямлі. У вёску прыязджаў вярбоўшчык, бадай з Бельска. Начаваў аднойчы ў дзядзькі. Пачаставалі яго, выпілі, і дзядзька пытае:

— То і мне можа выехаць?

— Хозяин, ты никуда не уезжай, там тебе будет плохо, — адказаў госць.

Тыя, што выехалі, усе трапілі ў калгасы, недалёка, пераважна ў Беларусі. Некаторыя пазней наведвалі Зубава.

У 1949 годзе арганізавалі калгас у Зубаве — першы ў ваяводстве; назвалі яго „Піянер". Намовы вялікай у калгас не было, але прымушала туды ўступаць бяда і вялікія падаткі. Спярша пайшлі бедныя. Пасля, калі паўстала партыя, то і партыйныя ў калгас запісаліся. А пасля і багацейшыя... Тату ў турму забралі за тое, што не здаў абавязковых паставак, хаця яшчэ збожжа ў ляшках стаяла. І яшчэ аднаго гаспадара забралі сядзець.

У Пасынках жыў чалавек, які захаваў у сябе даваенную камуністычную лістоўку, у якой было напісана, што ў сацыялізме і камунізме не будзе падаткаў. Завітаў да яго зборшчык падаткаў, то ён паехаў у камітэт з той газеткай, паказаў там. І больш яму плацежных ордэраў не прысылалі.

Чатырох гаспадароў абмалацілі — прыехала машына з ПОМ-а, змалацілі ўсё збожжа і ўсё зерне забралі, а да таго ж забралі яшчэ ўсіх коней і кароў, толькі куры асталіся. А ад збожжа толькі салома з паловай асталіся. Так раскулачвалі... Вызначылі чарговага гаспадара, раскулачваць, яго зяць быў у камітэце. Паехалі людзі ў Варшаву за ратункам і Варшава забараніла больш так рабіць.

А пасля сталі ўспыхаць у Зубаве пажары. Пагарэльцаў арыштоўвалі і ставілі ўмову: запішашся ў калгас — у турму не пойдзеш сядзець. Было шмат пажараў, мо каля васьмі; так рабілі ўсё, каб людзей у калгас прымусіць. А як настаў Гамулка, то той наш калгас адразу раскідаўся.

І прызыўных з багацейшых сем'яў — як кулакоў — бралі заміж у войска, у шахту; з Зубава было нас чатырох. Я трапіў туды ў 1952 годзе, то ўжо на два гады, бо раней бралі на тры гады; працаваў я на вугальнай шахце „Розбарк" у Бытаме. А вось некаторыя прызыўнікі з Кнаразоў працавалі на ўранавай шахце.

Прайшоў я курс забойшчыкаў, меў дачыненне з выбуховымі матэрыяламі. Забойшчык не меў права грузіць вугалю, ён наглядаў каб не было выпадку; грузілі вугаль два грузчыкі. Жылі мы ў бараках па сем чалавек у пакоі, але цесна не было. Працавалі на тры змены, змена доўжылася восем гадзін. Давалі нам вопратку і плацілі за работу як кожнаму шахцёру, толькі з нашых зарплат вылічвалі грошы на харчаванне; я зарабляў паўтары тысячы, то з гэтага на харчаванне забіралі шэсцьсот злотаў.

Працавалі кожны дзень, хаця па нядзелях праца не была абавязковай. Але працавалі і па нядзелях, каб план выканаць. І на звальненні можна было выходзіць на горад.

Рабочую вопратку атрымлівалі мы на паўгода. І так у чорным хадзілі, бо навошта было мыць тое адзенне, калі з'едзеш уніз і яно зноў становіцца чорным. І так на забоі голыя працавалі. Калі прыходзілі ў шахту, тады ў лазні мундзір на кручку высока вешалі і пераапраналіся. Рабілі ад шостай раніцы да другой пасля абеду. Давалі нам з сабою бутэрброды на другое снеданне.

Пасля ўзрыву чакалі нейкі час, забяспечвалі выпрацоўку ад абвалу і грузілі пабіты вугаль. Была сутачная норма — выдабыць па сем з паловай тон вугалю ад асобы. Камандзе з забойшчыка і двух грузчыкаў трэба было выдабыць дваццаць дзве з паловай тоны вугалю за змену. Бывала, што і па трыццаць тон здабывалі, дабіваўся я і стосемідзесяціпрацэнтнага выканання нормы. Навучыліся мы некаторых фокусаў, якія паскаралі загрузку вугалю ў вагончыкі.

На шахце працавалі людзі з „падазроных" саслоўяў. Напрыклад, з Кнаразоў трапіў у шахту адзін селянін, якога старшыня намаўляў у калгас, а ён адказаў нагаворшчыку: „Сп...". І на трэці дзень ужо прызыў у шахту атрымаў. Было многа немцаў і югаславаў. І з Беласточчыны многа было прызыўнікоў. Пасля нас у шахту прывезлі турэмшчыкаў. Было там восем чалавек з Беластока. Лягалі яны галовамі да сябе і пра нешта гаварылі, а калі хто да іх набліжаўся — змаўкалі. І ніхто не ведаў, пра што яны гаварылі.

Пасля вайны мае равеснікі, апрача аднаго, лётчыка, не прадаўжалі адукацыі — хто колькі класаў меў, пры той адукацыі і астаўся. А пасля хадзілі мы ў вечаровую школу і ўсе атрымалі пачатковую адукацыю. Пасля шахтаў працаваў я ў пункце прыёму малака, пустакі выраблялі, шыў, быў рахункаводам у сельскагаспадарчым кааператыве.

Запісаў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Алег ЛАТЫШОНАК

У ВАЙСКОЙ НА 200-Ю ГАДАВІНУ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ПЛАКІДА ЯНКОЎСКАГА

Аўтара таямнічых «Рассказов на белорусском наречии» даследчыкі шукаюць ужо некалькі гадоў. Гэтая чытанка для школьнікаў, напісаная на розных гаворках і выдадзеная афіцыйна царскімі ўладамі ў Вільні ў 1863 годзе, разбурае закамянелыя стэрэатыпы беларускай гісторыі, таму відаць і не мае належнай павагі. Не пісаў жа Кастусь Каліноўскі, што «як дзень з ночай не ходзіць разам, так не ідзе разам навука праўдзіва з няволяй маскоўскай»?

Усё ж такі напісаў нехта і выдаў першы нарыс гісторыі Беларусі на беларускай мове. Напісаў, канкрэтна, на заходнепалескай гаворцы, якой лічыў беларускай: «Кто булы наши найдавнийшіи диды, якая була ихъ доля до Уніи?». Успомнім, стаяў 1863 год і ніякай беларускай літаратурнай мовы не існавала. Кожны беларус беларускай мовай лічыў сваю гаворку.

Ігар Запрудскі аўтарам «Кто булы…» палічыў Міхайлу Каяловіча. Але той нарадзіўся ў Кузніцы-Беластоцкай, дзе гавораць на гарадзенскай гаворцы ды заходнепалескай гаворкай не валодаў. Больш таго, пішучы пра Міхайлу Баброўскага (ураджэнца Волькі, што пад Кляшчэлямі), назваў ягоную мову маларускай, значыць — падляшскіх (і заходнепалескіх) гаворак беларускімі не лічыў. Я пачаткова думаў, што аўтарам «Расказаў» быў Ігнат Кулакоўскі, родам з Янаўшчыны пад Сухопалем, што пад Пружанамі. На жаль, мая стройная канцэпцыя праваліласа, калі Фёдар Клімчук даслаў мне карту гаворак Пружаншчыны, апрацаваную Алёнай Босак і Віктарам Босакам. Сухопаль гэта акаючыя, дзекаючыя і цекаючыя паўночнабрэсцкія гаворкі, а Кулакоўскі ніколі не меў кантакту з такой заходнепалескай гаворкай (або гаворкамі), на якой былі напісаны некаторыя «Расказы». Пры нагодзе аказалася, што можна адкінуць падказаную мне Сяргеем Токцем кандыдатуру Паўла Баброўскага, якую падтрымаў і Дарафей Фіёнік. Павел Баброўскі выхаваўся ў свайго стрыя Міхайлы ў Шарашове, дзе окаюць, але дзекаюць і цекаюць. Цікава толькі, што Баброўскі запісаў расказ пра Шарашова якраз на гаворцы, даволі блізкай нашым «Расказам». Паўночнаагародскія гаворкі падходзяць амаль пад самае Шарашова, дык у мястэчку маглі жыць і іх носьбіты. Але мову гэтую, не згаджаючыся з Каяловічам адносна быццам бы маларускай мовы, на якой гаварыў Міхайла Баброўскі, Павел Баброўскі назваў чарнарускай, а не беларускай.

Пінскі гісторык і краязнаўца Аляксандр Ільін некалькі гадоў таму прадставіў іншую кандыдатуру на аўтара чытанкі — а. Плакіда Янкоўскага. Янкоўскі нарадзіўся ў Вайской (якую ў літаратуры памылкова называюць часам Войскай) пад Камянцом, дзе яго бацька быў уніяцкім святаром. Вучыўся ў Свіслацкай і Брэсцкай гімназіях і Віленскім універсітэце, дзе атрымаў ступень доктара тэалогіі. Стаў уніяцкім святаром, а пасля адным з першых пагадзіўся перайсці ў праваслаўе. Навучаў у Жыровіцкай духоўнай семінарыі. Янкоўскі быў пладавітым польскім пісьменнікам і перакладчыкам з англійскай мовы. Пасля стаў пісаць па-руску. А. Ільін скансультаваў сваю думку з Фёдарам Клімчуком, паводле якога мова «Расказаў» найбольш адпавядае аколіцам Камянца.

Протаіерэй Плакід Янкоўскі пад канец жыцця

Паніхіда за Плакіда Янкоўскага

Калі я падзяліўся думкай А. Ільіна з сяброўкай, якая ў навуковых вандраваннях стаптала шмат Беларусі, тая абурылася. Паводле яе, у Вайской дзекаюць і цекаюць, сама чула. Тут я разгубіўся. Ачомаўшыся, я вырашыў сам паслухаць як сапраўды там гавораць. Папрасіў Дарафея Фіёніка, якому ўсё Вялікае Падляшша роднае, каб мяне туды завёз. Дарафей раней прыслаў мне запісы песень і абрадаў у выкананні ансамбля, у якім спяваюць жанчыны з Вайской і суседніх Лісоўчыц. Паслухаўшы, мне здалося, што мова падобная да мовы «Расказаў».

Дарафей знайшоў нават цудоўную прычыну дзеля паездкі — 3 кастрычніка спаўнялася 200 гадоў з дня нараджэння Плакіда Янкоўскага. Гэтага дня паехалі мы на выслужанай машыне Дарафея з Уладзімірам Весялоўскім з бельскіх «Васілёчкаў». Заехалі ў Вайскую, якая аказалася зусім не вёсачкай сярод лесу, чаго я падсвядома чакаў, а аграмадным калгасным пасёлкам. Пад царквой нас ужо чакала Людміла Бунеева, журналістка «Вечернего Бреста», якая прыехала адмыслова з водпуску, які праводзіла ў Салігорску. Неўзабаве пад'ехаў на джыпе а. Іаан Агіевіч, настаяцель мясцовай царквы. Царква цудоўная, помніць не толькі а. Плакіда, але і даўнейшыя часы — паходзіць з XVI ст. Дакладна, як устанавіў мясцовы краязнаўца Георгі Мусевіч, з 1587 г. Фундавала яе княжна Аляксандра Вішнявецкая з роду Капустаў. Айцец Іаан (родам, а як жа, са славутага Рубеля, з якога паходзіць каля 150 святароў!) расказаў нам пра царкву і сяло. Аказалася, што тутэйшых у Вайской толькі жменька. Аграмадная большасць гэта прышэльцы, часткова перасяленцы з чарнобыльскай зоны. Наогул, у Вайской пражываюць прадстаўнікі 16 нацыянальнасцей. Вось чым тлумачыцца дзеканне і цеканне, якое пачула тут мая калега. Тут далучыў да нас сам Георгі Мусевіч і два мастакі: Анатоль Туркоў і Уладзімір Чыквін. Паглядзелі могілкі, дзе адчыталі польскі (з выразным налётам „крэсавай" пальшчызны) надпіс на магіле Альжбеты Гамаліцкай з роду Слаўтаў: „Dom Elżbiety Homolickiej ur. 1786 zmar. 1857 stycz. 28 d. Drogiej mamie wdzięczne dzieci pomnik ten położyli". Дарафей здагадваецца, ці гэта не жонка а. Іпаліта Гамаліцкага, рэктара Жыровіцкай духоўнай семінарыі. Пераходзім у царкву. Айцец Іаан, які ўжо пасля абедні маліўся з вернікамі за а. Плакіда Янкоўскага, адслужыў паніхіду.

Пасля мы падаліся ў Камянец, дзе паглядзелі славутую вежу і прызямліліся ў майстэрні Анатоля Туркова. Неўзабаве далучылі да нас трое мастакоў з Польшчы, якія прыехалі ў Камянец на пленэр імя Уладзіміра Дарашэвіча. Крышку заседзеліся, а тут у Лісоўчыцах нас яшчэ чакалі жанчыны са згаданага ўжо ансамбля. Вяртаемся пад Вайскую. Лісоўчыцкія жанчыны амаль ужо замерзлі чакаючы на лавачцы. Заходзім у гасцінную хату на чарговае застолле. Нарэшце можам наслухацца як людзі тут гавораць. Дам ім Божа здароўе, добрыя яны, але гаворка іхняя не тая. Гавораць «він», «мніго», а не «вун», «мнуго». Навукова называючы, відаць у іх гаворка сярэднезагародская, падчас як у «Расказах» — паўночназагародская.

Такім чынам, гэта не Плакід Янкоўскі аўтар «Расказаў». І мова не тая, і пазіцыя іншая. Сам Янкоўскі хутчэй за ўсё лічыў сябе ліцьвінам. Аўтар, ці аўтары «Расказаў» мелі цвёрдую пазіцыю: усе, да якіх накіраваная чытанка, ці яны жывуць пад Берасцем, ці пад Віцебскам — беларусы, патомкі крывічоў, з дзяржаўнай традыцыяй ад Полацкага княства. Тым часам Янкоўскі, аб чым ведае і А. Ільін, лічыў такую пазіцыю памылковай. Пра таго ж самага Міхайлу Баброўскага ён напісаў у 1864 г., што той у Шарашове і Пружанах навучаў вернікаў «на простонародном наречии, именуемым с некоторого времени вовсе неправильно *белорусским*». На думку Янкоўскага, гэтая гаворка павінна называцца чырвонарускай, або галіцкай, а прычынай гэтага падабенства лічыў прыналежнасць значнай часткі Гродзенскай губерні да колішняга Галіцкага каралеўства.

Прачытаўшы «Кто булы…» каторы раз, я прыйшоў да высновы, што аўтар мог быць пінчуком, бо і мова туды цягне, і пачынае ён са слоў: «Сторона, дэ жывуть тэпэр Пыньчуки, Мынчуки, Вытобци, Могилевци, зовэтця Билою Руссю». На канец я залез у інтэрнэт і знайшоў іншы артыкул А. Ільіна, пра аўтарства «Пінскай шляхты», якую ён прыпісаў Стэфану Куклінскаму (чый род каранямі з-пад Заблудава). Мімаходзь А. Ільін заўважыў, што Куклінскі мог напісаць і «Расказы». Адносна аўтарства «Пінскай шляхты», дык мне здаецца, што ўсё ж такі напісаў яе Вікент Дунін-Марцінкевіч. А пра тое, ці першы нарыс гісторыі Беларусі па-беларуску мог напісаць наш зямляк — іншым разам.

У Лісоўчыцах

Беларускі дзень у Седльцах

Адам БОБРЫК

У Седльцах 27 кастрычніка гасцяваў пасол Беларусі Віктар Гайсёнак. Быў гэта трэці ягоны візіт у гэты горад, але першы з такой шырокай праграмай. На працягу аднаго дня пасол сустрэўся з уладамі горада, вучнямі І Агульнаадукацыйнага ліцэя ім. Баляслава Пруса, вернікамі праваслаўнага Свята-Троіцкага прыхода, працаўнікамі і студэнтамі Прыродазнаўча-гуманітарнага ўніверсітэта ды ўсклаў кветкі да магіл салдат Чырвонай Арміі.

Выступае амбасадар РБ у Польшчы Віктар Гайсёнак

У Прыродазнаўча-гуманітарным універсітэце Віктар Гайсёнак і рэктар праф. Антоні Юўка абмеркавалі пытанні навуковага супрацоўніцтва і абмену моладдзю. Пасол выказаў волю падтрымкі кантактаў паміж акадэмічнымі цэнтрамі. Сядлецкая вучэльня з 1986 года супрацоўнічае з Брэсцкім дзяржаўным універсітэтам імя Аляксандра Пушкіна, а з 2001 года — з Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы. Віншуючы з атрыманнем 1 кастрычніка статусу ўніверсітэта, пасол адзначыў, што шмат разоў сустракаўся з высокімі ацэнкамі працы навукоўцаў гэтай падляшскай навуковай установы. Заахвочваў ён развіваць кантакты з Беларуссю, а таксама ўвесці навучанне беларускай мове ў якасці прадмета. Віктар Гайсёнак, па адукацыі фізік, прафесар і былы рэктар ды міністр адукацыі, сустрэўся з працаўнікамі Інстытута матэматыкі і фізікі Аддзялення дакладных навук ПГУ. Прыняў ён удзел у навуковым семінары і выслухаў даклад праф. Майкла Аланіі „Касмічная радыяцыя і дынамічныя працэсы ў геліясферы".

Пазней у ліцэі пасол адказаў на пытанні вучняў наконт Беларусі. Моладзь мела нагоду падзяліцца сваімі заўвагамі і разважаннямі аб сітуацыі ў гэтай краіне. Частка з іх выязджала ў Беларусь. Пасол з задавальненнем успрыняў станоўчыя выказванні вучняў. Яны сваіх ацэнак не суадносілі з палітычнымі пытаннямі, затое гаварылі пра сардэчнасць, адкрытасць і гаспадарлівасць беларускага народа. Адзін з вучняў проста сказаў: „Беларусь, якую я пабачыў на свае вочы, у нічым не нагадвала тую, якую паказваюць у мас-медыях". Дырэктар ліцэя Анджэй Копец выказаў жаданне наладзіць супрацоўніцтва з беларускай школай. Сказаў ён, што яго-ная школа ўжо супрацоўнічае з гімназіяй у Кіраве (Расія), адлеглым на 2 тысячы кіламетраў ад Седльцаў. Супрацоўніцтва з беларускай школай дазволіла б уключыць у гэты працэс большую групу вучняў.

Важным пунктам візіту была сустрэча ва Управе горада. Прэзідэнт горада Войцех Кудэльскі падкрэсліў станоўчы вопыт самаўрадавага супрацоўніцтва. Седльцы супрацоўнічаюць з Ваўкавыскім раёнам. Асаблівыя вынікі дасягнуты ў галіне культуры і асветы, аднак адчуваецца недастатак у галіне эканомікі. Была дасягнута дамоўленасць, што Седльцы наведае гандлёвы дарадчык Пасольства РБ. Прэзідэнт Кудэльскі звярнуўся з прапановай пашырэння супрацоўніцтва ў галіне турызму, асабліва па Бугу. Спрашчэнне гранічных працэдур дазволіла б, напрыклад, на арганізаванне байдарачных паходаў, што прыдало б рэгіёну большай прывабнасці.

На заканчэнне пабыўкі ва ўніверсітэце Віктар Гайсёнак прачытаў лекцыю на тэму „Унутраная і знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь". Выступленне пасла карысталася вялікім зацікаўленнем (для часткі слухачоў у час гадзіннай лекцыі не хапіла сядзячых месц). Пасол адзначыў, што Беларусь зацікаўлена ўраўнаважаным супрацоўніцтвам як з Расіяй, так і з Еўрапейскім Саюзам у палітычнай і эканамічнай сферах. Экспартна-імпартныя здзелкі Беларусь рэалізуе са 181 краінай. Тавараабарот з Польшчай, нягледзячы на геаграфічную блізкасць, складае толькі 3,2%. Патэнцыял супрацоўніцтва намнога большы. Беларусь зацікаўлена павелічэннем аб'ёмаў гандлю і інвестыцый. Пасол не пазбягаў цяжкіх тэм, заахвочваючы да дыскусіі. Госць адзначыў, што найважнейшай справай з'яўляецца вядзенне дыялогу, а Беларусь на гэта адкрытая. Пасол сцвердзіў, што дыскусія была плённая, а размовы аб не заўсёды лёгкіх, але важных справах вяліся ў канструктыўнай атмасферы. Усцешыла яго вялікае зайцікаўленне моладзі. „Гэта быў плённы дзень, — сказаў пасол Гайсёнак, — сапраўдны беларускі дзень у Седльцах". „Такія сустрэчы вельмі важныя асабліва там, дзе мала беларусаў. Набліжаюць яны і краіну, і народ", — сказала студэнтка ПГУ Кацярына Гаўрылюк.

Белорусы Москвы

Аб тым, што многа беларусаў раскінутых па цэлым свеце, „Ніва" пісала неаднойчы. Чытачы газеты знаёміліся з жыццём і дзейнасцю беларускай дыяспары ў розных краінах свету. У большасці на сайтах беларускіх дыяспар беларуская мова не ў загане. І гэта зразумела — як інакш можна беларусам праявіць сваю адметнасць, абазначыць сябе сярод іншых народаў таго ж самага колеру скуры, той жа самай веры і тых жа самых звычак.

Як не дзіўна, але некаторыя беларускія дыспары па-іншаму падыходзяць да праблемы захавання роднай мовы на чужыне. Адным з прыкладаў такога „іншага" стаўлення можа паслужыць Рэгіянальная нацыянальна-культурная аўтаномія „Белорусы Москвы", сайт якой месціцца па адрасе **http://belmos.ru.**

Калі цікаўны карыстальнік зазірне на гэты сайт, то знайсці тэкст на беларускай мове яму наўрад ці ўдасца. Па меншай меры, аўтару гэтых радкоў не пашчасціла адшукаць нейкі беларускамоўны артыкул. Па-беларуску тут пададзены толькі радок з „Новай зямлі" Якуба Коласа — „Мой родны кут, як ты мне мілы" і зададзена пытанне: „Як Вы лічыце, ці патрэбен беларусам у Маскве свой культурны цэнтр?". На гэтым беларуская мова ў карыстанні беларусаў у Маскве, якія стварылі згаданы сайт, канчаецца.

Для тых з беларусаў па ўсім свеце, якія добра валодаюць рускай мовай, будзе даступна інфармацыя аб арганізацыі, якой належыць сайт. З левага боку на галоўнай старонцы месціцца эмблема арганізацыі — выява заснавальніка Масквы князя Юрыя Даўгарукага на кані, якая знізу пераплецена стужкамі расійскага трыколеру і беларускага дзяржаўнага чырвона-зялёнага сцяга. На яе трэба клікнуць. Магчыма, у гэтай эмблеме і крыецца разгадка такога стаўлення да роднай мовы дадзеных беларусаў — беларуская мова чамусьці больш распаўсюджана сярод сайтаў, уладальнікі якіх лічацць сваім сімвалам бел-чырвона-белае палотнішча.

Паколькі „Белорусы Москвы" не надта дбаюць аб захаванні роднай мовы ў беларускай дыяспары расійскай сталіцы, то, магчыма, ім залежыць на прадаўсталенні цалкам зрусіфікаваным беларусам парад, якія зробяць больш-менш цікавым і бяспечным жыццё апошніх. Сапраўды, тут ёсць рубрыка „Полезные статьи" („Карысныя артыкулы"). Там можна даведацца, як лягчэй даехаць да аэрапорта Шарамецьева ад Беларускага вакзала, а таксама, дзе можна набыць беларускія тавары ў Маскве. Шчыра кажучы, такая інфармацыя не надта часта патрабуецца беларусам, якія ў асноўнай сваёй масе прыязджаюць у расійскую сталіцу выключна, каб зарабіць грошай альбо ўладкавацца ў ёй на пастаяннае жыццё.

Ёсць на сайце і „Новости российско-белорусского сотрудничества" („Навіны расійска-беларускага супрацоўніцтва"). Праўда, у іх, сярод датычных Беларусі паведамленняў, чамусьці распавядаецца, што ў Маскве пачалі зачышчаць вуліцы ад кіёскаў ці што кожны пяты расіянін вырашыў у хуткім часе набыць аўтамабіль.

Разам з тым, нягледзячы на ўсе хібы, нельга прызнаць дадзены сайт непатрэбным. На ім размешчана інфармацыя аб іншых суполках беларускай дыяспары ў Расіі, даюцца іх кантакты. Ды і ўвогуле добра, што беларусы ў Маскве, хай сабе і без мовы, помняць, што яны беларусы.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

І зноў брава БАТЭ!

Футбольны барысаўскі БАТЭ працягвае цешыць сваіх прыхільнікаў. Новай вяршыняй, якую скарыў клуб з Мінскай вобласці, стаў датэрміновы выхад у плэй-оф Лігі Еўропы. У групе „Е" барысаўцы справіліся з гэтым заданнем усяго за 4 туры. Перамога з лікам 3:1 над тыраспальскім „Шэрыфам" забяспечыла ім гэтае права. Зараз табліца квартэта спаборнікаў выглядае так: БАТЭ — 10 ачкоў, „Дынама" (Кіеў, Украіна) — 7, АЗ (Алкмаар, Нідэрланды) — 3, „Шэрыф" — 3. БАТЭ ўжо забяспечыў сабе месца ў 1/16-й фіналу. Напярэдадзе будзе не такі важны, але прынцыповы матч з кіяўлянамі, дзе ёсць шанц пацвердзіць першынство ў групе.

Вікторыя над інтэрнацыянальным „Шэрыфам" далася немалой крывёй. І ад таго яе каштоўнасць толькі ўзрастае. Пры тым беларусы, двойчы адолеўшы тыраспальцаў, значна палепшылі баланс дачыненняў з прадстаўнікамі Малдовы. Цяпер ён такі: 6 перамог, 3 нічыі і толькі адна параза. Праўда, „Шэрыф", які трэніруе, дарэчы, беларускі спецыяліст Андрэй Сасніцкі, з Прыднястроўя (чыя гэта цяпер зямля, ведае хіба толькі Бог!) не зусім малдоўскі клуб. Што датычыць статыстыкі, то яна толькі радуе — БАТЭ ў гэтым еўракубкавым сезоне правёў 10 сустрэч: +7=2-1. Адзначым і той факт, што форвард Віталь Радзівонаў забіў 10-ы гол у кантынентальных кубках і дагнаў айчынных лідараў у гэтай намінацыі — Георгія Кандрацьева і Генадзя Блізнюка. Сіла цяперашняга БАТЭ найперш у зладжанай камандавай гульні і ў моцы клубнай інфраструктуры. Прыклад варты для пераймання, які, аднак, не спяшаюцца ўзяць за аснову іншыя менеджары і кіраўнікі каманд.

А ў нацыянальным чэмпіянаце застаецца толькі два туры. Пытанне чэмпіёнства яшчэ не вырашанае. У гэты панядзелак адбылася беларуская „класіка" — матч БАТЭ — „Дынама" (Мінск). Напярэдадні яго верхняя частка турнірнай табліцы выглядала так: 1) БАТЭ — 66 ачкоў; 2) „Шахцёр" (Салігорск) — 63; 3) ФК „Мінск" — 54; 4) „Дынама" (Мінск) — 53. Як зразумела з гэтага, канкурэнцыю барысаўцам у змаганні за золата можа скласці толькі „Шахцёр", ну а два сталічныя клубы прэтэндуюць на бронзавыя медалі. Напружаным застаецца і становішча аўтсайдараў. Гродзенскі „Нёман" пасля перамогі ў апошнім туры над бабруйскай „Белшынай" 2:0 значна абнадзеіў сваіх прыхільнікаў. У нёманцаў зараз 25 пунктаў і яны ідуць на выратавальным 10-ым месцы. У жодзінскага „Тарпеда" — 22 ачкі, у сталічнага „Партызана" — 19. Апошняя каманда адразу пакіне вышэйшы дывізіён, перадапошняй давядзецца аспрэчваць месца пад сонцам у пераходных матчах. Шкада будзе, калі эліту пакіне самабытнае „Тарпеда" — адзіны ў краіне клуб, які карыстаецца на сваіх стадыёне і форме беларускай мовай. Найгоршыя шанцы „выжыць" у „партызанскага" калектыву, які, аднак, паспеў вызначыцца кубкавай сенсацыяй, выбіўшы з розыгрышу мінскае „Дынама".

Застаецца інтрыга і ў спрэчцы лепшых бамбардыраў. Пакуль у гонцы снайпераў напярэдадзе бразільскі легіянер БАТЭ Рэнан Брэсан — 13 галоў. На рахунку ва ўсіх сэнсах светлай галавы „Нёмана" Дзмітрыя Кавалёнка 12 трапных стрэлаў.

Пра глыбокі крызіс гродзенскага футбола сведчыць і той факт, што ўсе яго прадстаўнікі ў першай лізе таксама на самым дне — „Смаргонь", гродзенскі „Белкард", слонімскі „Камунальнік" і „Ліда" за апошні год дэградавалі зусім. А вось „Гомелю" для вяртання ў вышэйшы эшалон пасля вылету спатрэбіўся толькі сезон.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

„Гданьскія біяграфіі” — VII Дні нацыянальных меншасцей

Лена ГЛАГОЎСКАЯ

Фота Маі КУПТЭЛЬ

Ужо сёмы год запар прэзідэнт горада Гданьска супольна з нацыянальнымі меншасцямі арганізавалі „Гданьскія біяграфіі”, на якіх прэзентаваліся розныя праявы культуры іншых, чым польская, нацый. Свята стала ўжо традыцыяй, але штогод запаўняецца крыху іншым зместам і іншай формай. Неад’емнымі застаюцца музычная частка са спевамі і танцамі розных народаў ды прэзентацыя нацыянальнай кухні, якія прыцягваюць найбольшую публіку. Ужо другі год гэтая частка адбываецца ў Тэатры „Выбжэжэ”, вялікая сцэна якога стварае добрыя ўмовы для канцэртаў, а гледачы маюць камфортныя ўмовы для перажывання чарговых выступленняў. Варта нагадаць, што зала другі год запоўненая была амаль да апошняга месца. А выступалі ў тэатры нямецкі гурт „Маідэльс” з Семяновіц-Слёнскіх, украінскія гурты — танцавальны „Вітрогон” з Белага Бору і фолькава-рокавы „Кадарка” з Гданьска ды Аксана Тэрэфэнко з Вакальна-акцёрскай студыі імя Дануты Бадушковай з Гдыні, літоўская музычная група „Мэлёдыя” з Вільні, яўрэйскі гурт „Шалом” з Познані, татарская група „Муслімас” з Вільні, беларускі рок-гурт „Ріма” з Гарадка на Беласточчыне. Як заўсёды падсумаваннем марафона канцэртаў была вячэра, на якой прэзентаваліся нацыянальныя стравы. Аліна Крутэль з Беларускага культурнага таварыства „Хатка”, адказная за арганізацыю „Біяграфій...”, як заўсёды пастаралася, каб на беларускім стале была бульбяныя бабка і кішка, хлеб і мясныя вырабы з Гайнаўшчыны, хлебны квас сваёй работы. Ды нашы беларусы праявілі як штогод сваю кулінарную ініцыятыўнасць — Анна Мекін падрыхтавала гарбату на зёлках, спякла пірог ды наквасіла махункі, Марыся і Алесь Юзафовічы ўзбагацілі стол шмальцам з яблыкамі, квашанымі агуркамі, салам ды слівамі ў гарадоцкай самагонцы, Ева і Мірaслаў Матысюкі спяклі хатні хлеб. Як штогод ці не найбольшы натоўп людзей паспрабаць беларускія стравы сабраўся пры беларускім стале.

Гэта ўсё адбылося ў нядзелю, у апошні дзень „Біяграфій...”, якія папярэдзілі культурныя мерапрыемствы, падрыхтаваныя на працягу трох дзён, пачынаючы ад чацвярга, 21 кастрычніка. Тады менавіта ў памяшканні Саюза нямецкай меншасці адбыўся вернісаж фатаграфічнай выстаўкі „Двухмоўная Еўропа”, на якой прадстаўлены табліцы з падвойнымі назвамі ў розных краінах, уключна з Польшчай. Дарэчы, выстаўку варта было б паказаць у кожнай гміне Беласточчыны, дзе пражывае двухмоўнае насельніцтва, каб пераканаць яго ў культурнай вартасці такога падыходу да назваў мясцовасцей на мешаных этнічна і нацыянальна тэрыторыях. Пасля адкрыцця выстаўкі адбылася прэзентацыя абстрактнага мастацтва Марка Роткі (1903-1970) — яўрэя родам з Дзвінска, які з 1913 г. жыў у ЗША. На заканчэнне вечара адбыўся канцэрт гданьскага яўрэйскага барда Караля Каладзея.

У пятніцу 22 кастрычніка ў Гданьскай філіі Ваяводскай і гарадской публічнай бібліятэкі адбылася прэзентацыя зборніка паэзіі Міхася Куптэля „Разлады. Rozterki” (на здымку), які аўтар выдаў сваім коштам тыражом 20 (!) экземпляраў у мінулым годзе. Сустрэчу вяла журналістка і перакладчыца беларускай літаратуры Анна Сабэцкая. Вершы на польскай і беларускай мовах чыталі Аліна Крутэль і Надзея Вярбоўская. У другой частцы вечара Надзім Усеінаў прадставіў жыццё і творчасць татарскіх класікаў Ісмаіла бей Гаспрынскага (1851-1914) і Шаміля Алядзіна (1912-1996).

У суботу ў той жа бібліятэцы студэнткі Кацярына Комар і Дар’я Падух-Машчак з Саюза ўкраінскай незалежнай моладзі прадставілі мультымедыйную прэзентацыю „Тарас Шаўчэнка — вядомы і невядомы”. Шкада, што ў сувязі з хваробай дакладчыка не адбылася сустрэча з літоўскай паэзіяй Саламеі Нерыс.

Чарговыя „Гданьскія біяграфіі” паказалі на зацікаўленасць імі не толькі прадстаўнікоў нацыянальных меншасцей тут пражываючых, але і мясцовых палякаў. Выпадае сказаць асаблівае „дзякуй” Лідзіі Падлесьнай з рэферата культуры Гарадской управы ў Гданьску, якая ад сямі гадоў курыруе гэтую імпрэзу, фінансаваную з бюджэту горада.

Адгаданка

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — страфу Уладзіміра Караткевіча.

1. пісьмовы стол з шуфлядамі для захоўвання папер = 50 _ 49 _ 30 _ 31 _;
2. гарадок у Браслаўскім раёне з Троіцкім касцёлам = 36 _ 8 _ 14 _ 15 _ 62 _;
3. кіруе гмінай = 75 _ 76 _ 77 _ 74 _;
4. першы цотны лічэбнік = 28 _ 12 _ 27 _;
5. не ноч = 82 _ 83 _ 20 _ 19 _ 18 _;
6. адтуліна ў парванай вопратцы = 66 _ 67 _ 68 _ 64 _ 65 _;
7. адзінка сілы, якая адзін грам паскарае на адзін сантыметр у секунду = 32 _ 34 _ 33 _ 79 _;
8. расчышчанае месца ў лесе пад гаспадаранне = 5 _ 6 _ 21 _ 22 _;
9. подых ветру = 9 _ 29 _ 61 _ 37 _ 53 _;
10. напр., траншэя = 94 _ 95 _ 1 _;
11. напр., акунь = 23 _ 24 _ 43 _ 51 _;
12. жыхар вёскі = 2 _ 3 _ 48 _ 52 _ 73 _ 84 _ 78 _;
13. за Уралам = 59 _ 60 _ 54 _ 91 _ 38 _;
14. Анатоль, паэт з Гарошкава = 71 _ 72 _ 96 _;
15. пара сеяння = 86 _ 87 _ 85 _ 39 _ 40 _;
16. важная фігура, напр., у картах = 88 _ 89 _ 93 _;
17. з яе дождж = 63 _ 69 _ 70 _ 80 _ 81 _;
18. адкрытая галерэя ў верхняй частцы царкоўнага будынка = 7 _ 13 _ 10 _ 11 _;
19. збудаванне для рэлігійных абрадаў = 35 _ 56 _ 55 _ 25 _;
20. Герман, другі за Гагарыным касманаўт = 17 _ 42 _ 90 _ 46 _ 41 _;
21. яшчэ не мат = 4 _ 57 _ 58 _;
22. круты роў, лагчына = 44 _ 45 _;
23. рака ў Маскве = 16 _ 92 _ 47 _ 26 _.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 41 нумара

Вега, Іўе, каўнер, ліха, пай, пан, рай, сад, шып.

Рашэнне: **Калі ўспыхае вайна, першай гіне праўда.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

14.11 — 20.11

(22.03. — 20.04.) Развагу і асцярожнасць спалучыш з умеласцю трапных рашэнняў. Не будзе для цябе немагчымага. Зоркі табе крыху пакрыжуюць планы, ды канчаткова выйдзеш на гэтым добра. Давядзеш нейкую важную справу да канца. З 18.11. (да 22.11.) магчымае фантастычнае падарожжа. З 17.11. (да 21.11.) магчымыя перашкоды; не ўсе чыста гуляюць у тваім асяроддзі. Блізкія грошы.

(21.04. — 21.05.) Твая фартуна прыспешвае. Пры поўні Месяца напруга і стрэс. Старайся рэальна ацэньваць свае магчымасці, каб не выдурніцца, рабіўшы тое, што не ў тваёй натуры. Паявіцца асоба з мінулага (тады не мела значэння), сустрэча з якой не будзе выпадковай.

(22.05. — 22.06.) Усё можа здарыцца. Незвычайнае каханне, немалыя грошы. Засяродзься на найважнейшай працы. Некаторыя ранейшыя рашэнні яшчэ можна памяняць. Можаш пачуць крыўдныя словы ад аднаго ваўка ў авечай шкуры. 19-20.11. выберыся паспяхова памяняць свой імідж.

(23.06. — 23.07.) Прыдасца падазронасць у адносінах да некаторых асоб; пільнуйся, каб хто не выкарыстаў тваёй наіўнасці. Любоўныя думкі ў нічым табе не перашкодзяць. Знакаміта на працы; мноства ідэй на тое, каб дабіцца поспеху.

(24.07. — 23.08.) Шанцы на павышэнне: 14-18.11. Развівай таленты, можаш на іх зарабіць. З 18.11. (да 22.11.) нечаканыя, геніяльныя ідэі ды запал. Можаш крыху абмежаваць кампанейскія кантакты, падпачывай. Ды 15-19.11. будзе кепскі час на афармлянне спраў, патрабуючых прыхільнасці людзей.

(24.08. — 23.09.) Нойдзе на цябе ахвота наведаць блізкіх і далёкіх родзічаў, з некаторымі — вякі не бачыліся! Не падвядуць і старыя сябры, будуць з адкрытым сэрцам і... поўным халадзільнікам! Да грошай менш шчасця, ды бедаваць не будзеш.

(24.09. — 23.10.) Нечакана можа ўдацца небылое падарожжа. Прафесійныя планы маюць шанц на рэалізацыю. 14-18.11. моцна трымайся прынцыпаў і не слухай несумленных парад. З 18.11. не абвінавачвай нікога ў благіх намерах. Паваюй затое за належнае табе.

(24.10. — 22.11.) Мноства працы і амбітных выклікаў, ды не даказвай, што можаш. Пачынай справы, да якіх раней не меў упэўненасці. Плыві спакойна з плынню падзей. Знаёмства з кімсьці незвычайным можа адмяніць тваё жыццё.

(23.11. — 22.12.) Прадбачваецца твае пяць хвілін! Можаш заззяць, выйграць у латарэю, а нават пачаць вялікую кар’еру. У пары праводзь разам як найбольш часу. А калі ў цябе пары няма, будзь добрай думкі. Цікава бачацца знаёмствы наладжаныя шляхам інтэрнэту.

(23.12. — 20.01.) Ідэальны момант для карэктуры планаў, можаш без болю адысці ад цяжкіх абавязацельстваў, вырашыць іначай — твае рашэнні будуць трапныя. 14-17.11. зловіш рэдкую нагоду і выкарыстаеш магчымасці, якіх да гэтай пары не меў. Са здароўем добра, толькі не нервуйся, калі, скажам, папсуецца табе камп’ютар.

(21.01. — 19.02.) 17-21.11. — фантастычны настрой, аптымізм і жыццярадаснасць. Вельмі многа мілых сюрпрызаў. Не паддавайся, бо ж цэніш нялёгкія перамогі.

(20.02. — 21.03.) 17-21.11. дзейнічай адважна, ды з развагай. Разумная тактыка — ключ да поспеху. З 18.11. могуць крыху папсаваць адносіны з калегамі. Праводзь шмат часу з сям’ёй і слухай парад старога сябры.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Мірaслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2010 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

У Новым Ляўкове новае „Бязмежжа”

Міра ЛУКША

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Частка ўдзельнікаў семінара ў Бельскім белліцэі

Урочышча Лазовае з распаложаным тут агратурыстычным асяродкам „Бора-Здрой” стала ад некалькіх гадоў пастаянным месцам сустрэч удзельнікаў літаратурнага міжнароднага семінара „Бязмежжа”. Своеасабліваму мастацка-літаратурна-крытычнаму майстар-класу відаць спрыяе клімат гэтага месца, зрэалізаванага творчым чалавекам Барысам Казлоўскім. Мерапрыемства, ужо чатырнаццатае па ліку, сарганізаванае Праграмнай радай тыднёвіка „Ніва” і Беларускім саюзам пры фінансавай падтрымцы міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі РП, працягвалася ад 5 да 7 лістапада і сабрала аўтараў, крытыкаў, выдаўцоў, перакладчыкаў, даследчыкаў і журналістаў з абодвух бакоў мяжы і кранала сваім абсягам не толькі сучасную творчасць, аўтараў і распаўсюд літаратуры — кніжны і медыйны, а сягала і ў мінулае культуры і гісторыі Беларусі. Ужо сам пералік удзельнікаў сведчыць аб абсягу сустрэчы. Міхась Андрасюк — пісьменнік і радыёжурналіст, Яўген Вапа — выдавец, рэдактар, Ганна Кандрацюк — пісьменніца, спявачка і журналістка, Алег Латышонак — гісторык, перакладчык; Мікола Ваўранюк — тэлежурналіст, перакладчык; Марцін Рэмбач — перакладчык, журналіст; Яўген Янчук — настаўнік, інтэрнэт-журналіст; Наталля Герасімюк — радыёжурналістка, перакладчыца; Надзея Артымовіч — пісьменніца; Яраслаў Іванюк — перакладчык, інтэрнэт-бібліятэкар „Камунікату”; Віктар Стахвюк — пісьменнік; Янка Целушэцкі — паэт, журналіст; Аляксандр Максімюк — інтэрнэт-рэдактар (www.swoja.org), перакладчык; Барыс Пятровіч Сачанка — галоўны рэдактар часопіса „Дзеяслоў”, пісьменнік; Андрэй Хадановіч — паэт, перакладчык, старшыня Беларускага ПЭН-Цэнтра; Юля Цімафеева — перакладчыца — інтэрнэт-журнал „ПрайдзіСвет”; Анатоль Івашчанка — паэт; Павал Касцюкевіч — празаік, перакладчык (м.інш. з іўрыту); Алесь Зайцаў — бард; Дарафей Фіёнік — выдавец, аніматар культуры, журналіст. Абсяг, адкуль родам удзельнікі — таксама шырокі — ад былой вёскі з чарнобыльскай зоны, адкуль перакладчыца Юля Цімафеева, праз Мінск, Высокае, Бельск, Гайнаўку, Беласток, да Кутлоўкі і Трасцянкі і да Тэль-Авіва. І ад літаратуры, перакладаў — да дакументальнага фільма. Сустрэча была агучана ў тэлебачанні і радыё, дзякуючы чаму становяцца бліжэйшымі беларускаму (і не толькі) жыхару Беласточчыны такія значныя не толькі ў беларускім свеце асобы, як м.інш. Андрэй Хадановіч і іх творчасць і культурніцкая дзейнасць, а таксама вяртаюцца забытыя імёны і факты.

Сустрэча пачалася ад візіту ў адноўленым і цікава афармленым Бельскім беларускім ліцэі, які паказаў дырэктар і паэт Андрэй Сцепанюк. У будучыні будуць наладжаны бліжэйшыя кантакты паміж літаратурным асяроддзем Беларусі (Саюз беларускіх пісьменнікаў, ПЭН-Цэнтр) — арганізаваны аўтарскія сустрэчы і завоз новых кніг вучням, у бібліятэку. Калі гаворка пра беларускіх аўтараў, дык не толькі творчасць і асоб сучасных, маладых аўтараў абмяркоўвалася на „Бязмежжы”. Міра Лукша прадставіла творчасць беластоцкіх аўтараў розных пакаленняў, пералічваючы асобы і даты аўтараў пакалення таксама ўзросту бацькоў ці дзядоў удзельнікаў семінара, таксама шаноўных юбіляраў (Віктар Швед, Аляксандр Баршчэўскі, Васіль Петручук, Георгій Валкавыцкі), паказваючы таксама іх значэнне ў захаванні мовы, культуры і літаратуры ў нашым старонні. Пераканалася сама, што ўсё ж такі даходзіць наша творчасць на Бацькаўшчыну — адзін з наймаладзейшых аўтараў спытаўся пра яе стары (1994 г.) зборнік лірыкі „Ёсць”. Ды трэба было тлумачыць таксама ўплыў ці самастойнасць развіцця літаратуры на Беласточчыне ў параўнанні з літаратурай з Беларусі (хто быў чыім пераймальнікам, і ці быў увогуле) і ці набыткі беларускіх літаратараў другой паловы XX стагоддзя і цяперашніх могуць стаяць на адной паліцы. Бо, незалежна ад кандыцыі беларускага слова і мовы, лік выданняў павялічваецца ў добры бок, перш за ўсё дзякуючы незалежным выдавецтвам. Беларускі ПЭН-Цэнтр арганізуе конкурсы (напр. маладых літаратараў да стагоддзя газеты „Ніша ніва”, імя Карласа Шэрмана, імя Ларысы Геніюш), вылучаюцца прэміі двухмесячніка „Дзеяслоў”, выдаюцца кнігі ў яго бібліятэцы, выдаюцца кнігі ў бібліятэцы „Кнігарні пісьменніка”, выдавецтве Логвінаў. Беларуская бібліятэка пабагацела, вось, на кнігу, выдадзеную толькі што ў „Кнігарні пісьменніка” — Міхася Андрасюка, лаўрэата прэміі „Залаты апостраф” — „Вуліца добрай надзеі”. Яшчэ гарачыя выданні, так бы мовіць проста з друкарскага станка, заехалі на XIV „Бязмежжа” — між іншым і кніга Ганны Кандрацюк „Дзядоўскае турнэ з Анатолем С.” (выданне „Нівы”). Паказаны былі таксама свежыя фільмы — Міколы Ваўранюка пра паэтаў Анатоля Сыса родам з Гарошкава і Леаніда Дранько-Майсюка з Давыд-Гарадка, і фільмы Юрыя Каліны, сусветнавядомага аўтара тэлефільмаў пра нашых людзей. Словам — правінцыя, хоць неправінцыйныя аўтары. Не дарам адным з плёнаў „Бязмежжаў” было выданне-часопіс „Правінцыя” (згасла па прычыне нястачы фінансаў), дзе правінцыя сягала на ўсе кантыненты, гуртуючы беларускіх творцаў. І цяпер няма межаў — перакладчыцкі інтэрнэт-журнал прысвойвае сусветную літаратуру беларускаму свету. Пераклады — гэта набыткі беларускага слова, як адзначыў Павал Касцюкевіч, знакаміты празаік і перакладчык м.інш. з іўрыту. Беларускія словы перакладваюцца таксама на іншыя мовы, беларускія аўтары пішуць і па-польску („хоць гэта беларуская кніга”, як сказаў аўтар) — тут другую кнігу Міхася Андрасюка — першы яго раман „Wagon drugiej klasy” — адрэкамендаваў Марцін Рэмбач. У сучаснасць папяровае выданне варта падтрымліваць медыйнымі набыткамі — выступленнямі ў СМІ, жывымі сустрэчамі з чытачамі, інтэрнэнтымі выданнямі. Асабліва тады, калі няма доступу да папяровага выдання кнігі. Таму варта заглянуць на сайт „ПрайдзіСвету” — часопіса перакладной літараутры — prajdzisvet.org, інтэрнэтнай бібліятэкі Камунікат — www.kamunikat.org, пацікавіцца электроннымі версіямі „Дзеяслова” www.dziejasou.by, выданнямі і весткамі ПЭН-Цэнтра — www.pen.unibel.by. Там пазнаёміцца можам і з творчасцю аўтараў і сяброў „Бязмежжа” — літаратурнай і даследчыцкай, з галіны не толькі stricte літаратуразнаўчай. Тады можна натрапіць, напрыклад, на надта цікавы тэкст, як „Рассказы на белорусском наречии” пакуль невядомага аўтара, першую спробу навукой апрацоўкі беларускай гісторыі і першае апавяданне па-беларуску, на адной з паляшуцкіх гаворак, надрукаваную ў 1863 годзе (пра пошукі аўтара распавядаў на семінары пафесар Алег Латышонак). „Бязмежжа” сапраўды без межаў — ад Тэль-Авіва (Касцюкевіч) — да Кутлоўкі (Кандрацюк), а ўсе яны — „лятаюць над мястэчкамі” (Андрасюкова Гайнаўка) — ім усё бачна з нашага космасу.

ISSN 0546-1960